Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

**Серыя «Па вёсках нашага краю»**

# ГАРАДЗЕЦ – маленькі горад

***Інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік да 880-годдзя з часу першага згадвання ў гістарычных крыніцах в. ГАРАДЗЕЦ Кобрынскага раёна***

Кобрын
2022

УДК 016:911.373-908(476.7)
ББК 91.9:26.89(4Беи)
Г20

Серыя заснавана ў 2007 годзе

***Складальнік***
бібліёграф І катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі С. Д. Курачук

Г20 **Гарадзец – маленькі горад** : інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік да 880-годдзя з часу першага згадвання ў гістарычных крыніцах в. Гарадзец Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2022. – 72 с. : іл. – (Серыя «Па вёсках нашага краю»).

Выданне прысвечана юбілейнай даце - 880-годдзю з часу першага згадвання ў гістарычных крыніцах в. Гарадзец Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. У вёсцы са статусам «аграгарадок» даўняя і багатая гісторыя. І сёння гэты куток Кобрыншчыны мае зачараваны і непаўторны імідж, глыбокія культурныя традыцыі.

Прымеркаваны да Года гістарычнай памяці, інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік закліканы абудзіць пачуццё дачынення да гісторыі і сённяшняга дня сваёй малой радзімы, накіраваны на папулярызацыю гістарычнай спадчыны Кобрыншчыны як асновы патрыятычнага выхавання грамадзян. Выданне прызначана шырокаму колу карыстальнікаў.

**УДК 016:911.373-908(476.7)**
**ББК 91.9:26.89(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма, 2022

# ЗМЕСТ


**ПРАДМОВА** 4

**АД МІНУЛАГА ДА СУЧАСНАСЦІ** 5

З глыбіні тысячагоддзяў 5

Сімволіка малой радзімы 10

Вёска мовай статыстыкі 13

Прыказкі, прымаўкі з Гарадца 15

Сучасны імідж старажытнага Гарадца: пейзажы вясковыя – умовы гарадскія 16

Патрыётаў выхоўваюць з дзяцінства: «Гарадзецкі дзіцячы сад – сярэдняя школа» 19

Культурны цэнтр аграгарадка 23

ААТ «Гарадзец-агра» — буйнейшая гаспадарка Кобрыншчыны 26

Гарадзец шматканфесійны 30

Свята вёскі - незабыўны і ўрачысты дзень 36

**ВЯДОМЫЯ ЗЕМЛЯКІ** 38

**СПІС КРЫНІЦ** 47

**СПІС ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ**, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік 71

# ПРАДМОВА

«*Гарадзец – маленькі горад*» - чарговае выданне з серыі бібліяграфічных паказальнікаў пад агульнай назвай «Па вёсках нашага краю».

Інфармацыйна-аналітычны нарыс «*Хидры – первый агрогородок на Кобринщине*» быў прысвечаны Хідрам - вёсцы з найбольш развітай сацыяльнай і вытворчай інфраструктурай у Кобрынскім раёне, якая невыпадкова атрымала статус першага аграгарадка на Кобрыншчыне. Да 450-годдзя першага ўпамінання шматлікіх вёсак Кобрыншчыны на старонках гісторыі, першакрыніцай якіх з’явілася «Рэвізія Кобрынскай эканоміі, складзеная ў 1563 годзе каралеўскім рэвізорам Дзмітрыем Сапегам», выдадзены рэкамендацыйны бібліяграфічны спіс «*Сузор’е кобрынскіх вёсак*». Інфармацыйна-пазнавальны даведнік «*Скрозь памяць стагоддзяў*» прысвечаны прыгожай даце - 500-гадоваму юбілею вёсак Балоты, Стрыгава Кобрынскага раёна. Гісторыка-краязнаўчы нарыс «*Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні*» выдадзены да 550-годдзя з часу першага ўпамінання ў гістарычных крыніцах вёскі Дзівін Кобрынскага раёна. Нарыс «*Летапіс роднай старонкі*», які быў падрыхтаваны ў Год малой радзімы ў Рэспубліцы Беларусь, прысвечаны 500-годдзю з часу першага згадвання вёсцы Імянін Кобрынскага раёна. Інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік «*Малой радзімы прыцяжэнне*» выдадзены да 475-годдзя з часу першага пісьмовага ўпамінання вёсак Лелікава і Павіцце Кобрынскага раёна.

Выданне «Гарадзец – маленькі горад» прысвечана 880-годдзю з часу першага згадвання ў гістарычных крыніцах вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна. Раней вёска, а сёння аграгарадок, Гарадзец мае даўнюю і багатую гісторыю. Яшчэ ў XII стагоддзі паселішча ўзгадваецца ў летапісах, а пазней нават увайшло ў лік каралеўскіх «сталовых маёнткаў». Невыпадкова жыхары вёскі адчуваюць гонар за сваю малую радзіму, і да яе гісторыі ставяцца з павагай. Нямнога знойдзецца ў Беларусі вёсак, якія мелі гонар атрымаць у сярэднявеччы Магдэбургскае права. Гарадзец быў удастоены такой прывілеі ў 1589 годзе. А ў 1784 годзе тут спыняўся апошні правіцель Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Вёска мае свой герб і сцяг, што таксама не характэрна для сельскіх населеных пунктаў. Дарэчы, яшчэ ў той час гэтае мястэчка лічылася горадам. І сёння гэты куток Кобрыншчыны мае зачараваны і непаўторны імідж, глыбокія культурныя традыцыі. Жыхары Гарадца славяцца сваімі ўмелымі рукамі, талентамі і гасціннасцю, а аграхолдынг «Гарадзец-агра» з’яўляецца адным з вядучых сельгаспрадпрыемстваў у раёне.

Выданне змяшчае інфармацыю аб вёсцы-юбіляры, расказвае аб падзеях далёкага мінулага і сучаснасці, славутасцях, традыцыях, вядомых земляках. Удакладняюць інфармацыю фотаздымкі з сайта ўстановы адукацыі «Гарадзецкі дзіцячы сад – сярэдняя школа», архіва Гарадзецкай публічнай бібліятэкі-філіяла, фотагалерэі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі. Шырока прадстаўлена бібліяграфія.

Прымеркаваны да Года гістарычнай памяці, інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік заклікаы абудзіць пачуццё дачынення да гісторыі і сённяшняга дня сваёй малой радзімы, накіраваны на папулярызацыю гістарычнай спадчыны Кобрыншчыны як асновы патрыятычнага выхавання грамадзян.

Выданне прызначана шырокаму колу карыстальнікаў.

# АД МІНУЛАГА ДА СУЧАСНАСЦІ

## З глыбіні тысячагоддзяў




Цікавае мінулае мае мястэчка Гарадзец Кобрынскага раёна. Час і абставіны сцерлі яго значнасць і мясцовыя славутасці. Сёння яно больш нагадвае добраўпарадкаваную вёску, але так было не заўсёды.



На тэрыторыі Гарадца і яго мясцовасці можна і зараз знайсці старажытныя прылады працы, упрыгожванні, сякеры, малаткі. З гэтых першых стаянак першабытных людзей вырасла, па ўсёй верагоднасці, пасяленне, а потым і невялікі гарадок. Мяркуючы па назве паселішча, некалі тут быў замак або старажытнае ўмацаванне. Сама назва Гарадзец азначае «ўмацаванае сяленне», «горад».

Гарадзец вядомы з XII стагоддзя, згадваецца ў гістарычных крыніцах у 1142 годзе, у час княжацкіх міжусобіц. У 1287 годзе валынскі князь Уладзімір Васількавіч у духоўнай грамаце завяшчаў сваёй жонцы Вользе Раманаўне разам з горадам Кобрынам і сяло Гарадзец. Пазней, змяніўшы некалькіх уладальнікаў, Гарадзец перайшоў ва ўласнасць князёў Кобрынскіх. На іх грошы каля 1465 года тут пабудавана Свята-Ільінская царква, якая атрымала каралеўскі фундуш у 1539 годзе. Святыня дала назву адной з вуліц Гарадца. З ласкі князёў Кобрынскіх царква Святога Ілы была адорана 24 моргамі гарадской і 2 валокамі зямлі ў палях.

У 1563 годзе Гарадзец - горад і двор Кобрынскай эканоміі, з 1566 года - у Брэсцкім

ваяводстве ВКЛ. У горадзе, паводле каралеўскай рэвізіі, існавалі рынак, Ільінская царква, звыш 193 гаспадарак (паводле даследаванняў Ю. А. Якімовіча, 205 двароў), прадмесце, агароды. Упершыню з'явіліся запісы пра назвы вуліц Гарадца (Кобрынская, Прышахоцкая, Пінская, Грушаўская, Ільінская, Базарная). У двары Гарадзецкім меліся агароды, два млыны. Воласць Гарадзецкага двара складалася з 2 войтаўстваў. На Кобрынскай вуліцы стаяў каралеўскі двор з аднапавярховым сядзібным домам (палацыкам). У сярэдзіне XVI стагоддзя адбылася рэканструкцыя пабудовы ў адпаведнасці з валочнай памерай.

У 1586 годзе Гарадзец атрымала ў спадчыну каралева Ганна Ягелонка. Як і яе маці каралева Бона, Ганна была натурай практычнай, актыўнай і дзейнай, мела рэфарматарскі дух, стымулявала развіццё гандлю і рамёстваў. У 1588 годзе Гарадзец увайшоў у Кобрынскую каралеўскую эканомію ўжо ў якасці валаснога цэнтра, а 5 студзеня 1589 года разам з Кобрынам ад сваёй каралевы атрымаў Магдэбургскае права. Каралева і вялікая княгіня Ганна надала мястэчку Магдэбургскае права без уласнага кіравання і герб. Гарадзец па ўсіх справах падпарадкоўваўся Кобрынскаму магістрату, ратушы і магістрата тут не было. У 1588 годзе, акрамя Ільінскай царквы, у Гарадцы згадваецца таксама касцёл. У 1597 годзе ў горадзе 60 валок зямлі, з якіх 57 былі «на плаце», адна належала войту, дзве - царкве; меліся рынак, Ільінская царква, дом святара, агароды, млыны, пяць піўных і адна мядовая карчма. На тэрыторыі двара свіран, дом чэлядзі, кухня, пякарня, стайні, гумно, стадола.

У 1618 годзе горад налічваў 222 пляцы. У 1633 годзе дзейнічаў Гарадзецкі касцёл, для якога паводле ліста каралеўскага рэвізора Я. Валовіча былі адмераны 15 «аселых» і тры «пустыя» валокі зямлі ў сяле Грушава. У 1742 годзе Ільінская ўніяцкая царква карысталася 2 вольнымі валокамі зямлі, у 1789 годзе пад царквою лічылася 13 «вольных» пляцаў.

Пасля 1757 года Гарадзец - мястэчка, цэнтр Гарадзецкага ключа (уваходзілі вёскі Асмаловічы, Вуглы, Грушава, Камень Каралеўскі, Худлін і Чалішчавічы).

У 1784 годзе апошні польскі кароль, правіцель Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі праездам наведаў мястэчка па дарозе на Гродзенскі сейм. Адначасова кароль разам са світаю агледзеў пабудаваны Каралеўскі канал, праехаў па ім на велізарнай лодцы, накрытай балдахінам, да наступнага шлюза. На ўсім шляху яго віталі тысячы мясцовых жыхароў. Кароль быў вельмі зацікаўлены каналам і застаўся задаволены яго станам. Канал даваў магчымасць мясцоваму люду перапраўляць свае тавары аж да Гданьска, а таксама пашыраў іх надзелы за кошт асушанай зямлі. Адкрыццё канала дало зручны водны шлях, які злучыў басейн ракі Прыпяць з Заходнім Бугам. Варта адзначыць, што ідэя пабудовы гэтага канала была ўпершыню выказана яшчэ ў 1635 годзе маршалкам Юрыем Асалінскім. У гонар канала, які пасля наведвання манархам Рэчы Паспалітай атрымаў назву Каралеўскі, у 1786 годзе быў выбіты медаль.



У выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1795) Гарадзец апынуўся ў складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце. З 1801 года - у Гродзенскай губерні. У 1808 годзе сядзіба перайшла ў валоданне роду заможных шляхціц Ордаў, якія збудавалі тут мураваны палац.

Паводле малюнка Юзафа Крашэўскага, палац складаўся з align рознавялікіх аб'ёмаў, меў гладкую тынкоўку, вялікія вокны, высокі падмурак. Перад парадным уваходам існавала вялікая круглая клумба. Найбольш верагодна, што палац быў зруйнаваны яшчэ ў Першую сусветную вайну. Пра існаванне ў Гарадцы некалі шыкоўнага палацава-паркавага ансамбля нагадваюць адзінкавыя старыя дрэвы. Ён належыць да ліку страчанай гістарычнай спадчыны.



Гарадзец стаў цэнтрам воласці, у якім дзейнічалі праваслаўная царква, яўрэйская школа. Грузавыя баржы прымала прыстань на пракладзеным сярод палескіх балот Дняпроўска-Бугскім канале. Двойчы на год ладзіліся кірмашы.

Трэба адзначыць, што ў Гарадцы жылі свабодалюбівыя людзі, яны не аднойчы падымаліся супраць сваіх прыгнятальнікаў. Так, у жніўні 1820 года жыхары і сяляне мястэчка адмаўляліся выконваць павіннасці на карысць свайго ўладальніка. 24 жніўня ў Гарадзец прыбыў кобрынскі земскі спраўнік. Для падаўлення выступлення была выслана вайсковая каманда з 50 чалавек з мэтай прыняць любыя меры для прывядзення сялян да «належнай пакоры». У 1863 годзе ў Гарадцы і мясцовых вёсках успыхнула паўстанне, аднак яно было задушана, а ўдзельнікі прыгавораны да пакарання ўдарамі бізуном, кляймення і ссылкі ў Сібір. Практычна да самой рэвалюцыі 1917 года народ у Гарадцы бунтаваў супраць дэспатызму царскіх улад.

У 1860 годзе Гарадзец - мястэчка, 149 двароў, прыстань, да 1866 года дзейнічала каталіцкая парафія. У 1878 годзе 1264 жыхары, паштовая станцыя; у 1876 годзе ў Гарадзец перавезена драўляная Свята-Вазнясенская царква з в. Камень-Шляхецкі, якая захавалася да нашага часу.

У 1886 годзе - цэнтр Гарадзецкай воласці, 74 двары, 1331 жыхар, валаснoe праўленне, дзве царквы (у 1888 годзе 2576 вернікаў), дзве сінагогі, школа, чатыры крамы, тры заезныя двары, два ветраныя млыны, піцейны дом. Каля мястэчка сыраварня, ветраны млын. У 1890 годзе ў мястэчку 822 дзесяціны зямлі.

Маёнтак Гарадзец, уладанне П. Штэра, 5800 дзесяцін зямлі (разам з 4 фальваркамі). У 1897 годзе мястэчка, каля гандлёвага шляху Кобрын-Пінск, Палескай чыгункі, Дняпроўска-Бугскага канала; 279 двароў, 275 жылых дамоў, 1691 жыхар, дзве царквы, два яўрэйскія малітоўныя дамы, сінагога, народнае вучылішча (у 1889/1890 навучальным годзе было 82 хлопчыкі, 20 дзяўчынак, у 1892/1893 - 89 хлопчыкаў, 17 дзяўчынак; у 1905/1906 - 185 хлопчыкаў, 15 дзяўчынак), валаснoe праўленне, мяшчанская ўправа, пошта, хлебазапасны магазін, 14 крам, чатыры ветраныя млыны, чатыры кузні, цагельны завод, тры піцейныя дамы. У дзень Святой Тройцы праводзіліся кірмашы. Побач з мястэчкам знаходзіліся аднайменныя: маёнтак (пры чыгунцы), сем двароў, 51 жыхар; пасёлак (каля чыгуначнай станцыі), шэсць жыхароў; дом і млын, тры жыхары – уладанні П. П. Штэра. Пры Дняпроўска-Бугскім канале існавала плаціна № 1 з ахоўным домам другога ўчастка Брэсцка-Літоўскага аддзялення Ковенскай акругі, восем жыхароў.

У 1905 годзе ў мястэчку 2949 жыхароў, у маёнтку 22 жыхары, казённай плаціне - сем.



Гарадзец.
Узарваны чыгуначны мост праз раку Мухавец.
1916 год

Городец.
Взорванный железнодорожный мост через реку Мухавец.
1916 год

Gorodets.
Exploded railway bridge across Mukhavets River.
1916

У 1915 годзе Гарадзец акупаваны войскамі кайзераўскай Германіі, у 1919 годзе - польскімі войскамі. Кобрынская вуліца была поўнасцю спалена.

Згодна з Рыжскім мірным дагаворам 1921 года, мястэчка стала цэнтрам гміны Кобрынскага павета Палескага ваяводства буржуазнай Польшчы. Тут радзіма польскай пісьменніцы Марыі Радзевіч. Мястэчка і фальварак налічвалі 99 двароў, 688 жыхароў, чыгуначная станцыя Гарадзец — 10 двароў, 65 жыхароў.

У 1931 годзе Гарадзецкая гміна налічвала 418 км$^2$, 58 населеных пунктаў, 9500 жыхароў. У 1932 годзе ў Гарадцы быў пабудаваны Народны дом (мелася зала са сцэнай), пажарнае дэпо. З 1928 года дзейнічала бібліятэка (знаходзілася ў плябаніі), якая налічвала 611 кніг на польскай мове, 82 чытачы. У 1935 годзе была пракладзена шаша паміж Гарадцом і Антаполем, скончылася хутарызацыя сялянскіх гаспадарак.



*Чыгуначная станцыя в. Гарадзец*

З 1939 года вёска Гарадзец сярод вызваленых раёнаў Заходняй Беларусі, якія далучыліся да БССР. З 15 студзеня 1940 года Гарадзец уключаны ў склад Антопальскага раёна Брэсцкай вобласці, з 12 кастрычніка 1940 года стаў цэнтрам Гарадзецкага сельсавета. Першым старшынёй выканкама Гарадзецкага сельсавета быў Іван Главацкі, дэпутатам па Гарадцу абраны Гаўрыла Сітанасіцкі. Па колькасці двароў вёска перасягнула даваенны ўзровень. У 1940 годзе налічвалася 305 двароў, 1153 жыхары, два паравыя млыны, руская няпоўная сярэдняя школа, фельчарскі пункт, хата-чытальня, кааператыўная лаўка.



Але карэктывы ўнесла вайна... У Вялікую Айчынную вайну, з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 года, вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З першых дзён акупацыі тры атрады народных мсціўцаў не давалі ворагу спакою. Байцы ўстройвалі дыверсіі на чыгунцы, нападалі на паліцэйскую ўправу.

Нямецкія акупанты, рэалізуючы нацысцкую праграму знішчэння яўрэяў, стварылі чатыры гета на тэрыторыі Кобрынскага раёна, у тым ліку і ў Гарадцы. У 1942 годзе гета ў вёсцы было знішчана, забіты 269 яўрэяў. У 2005 годзе сваякамі забітых на месцы масавага забойства быў усталяваны помнік - на ўскраіне вёскі, у раёне пачатку вуліцы Гагарына.

На тэрыторыі Гарадзецкага сельсавета за гады вайны нямецка-фашысцкімі акупантамі загублена 209 чалавек мірнага насельніцтва, на катаржных работах у Германіі закатаваны тры чалавекі. У баях з фашызмам загінула 26 партызан, закатавана 25 падпольшчыкаў, 144 землякі не вярнуліся з фронту.



Як і Кобрын, Гарадзец быў вызвалены 20 ліпеня 1944 года. Для ўвекавечання памяці пахаваных у брацкай магіле 20 воінаў 12-й стралковай дывізіі 61-й арміі, якія загінулі пры вызваленні Гарадца ў ліпені, у 1958 годзе ў скверы пастаўлены помнік - скульптура савецкага салдата. Выява мужнага салдата, які схіліў галаву перад палітай крывёю гарадзецкай зямлёй, нагадвае пра агульны подзвіг арміі і народа ў ваенны час. Тут адбываюцца ўсе мерапрыемствы з гэтай нагоды: праводзяцца мітынгі памяці, ускладаюцца кветкі і вянкі.

Паступова мірнае жыццё наладжвалася. У пасляваенныя гады аднавілі дзейнасць цагельня, калгас, навучальныя, медыцынскія, сацыяльна-бытавыя ўстановы. У 1949 годзе ў Гарадцы была завершана калектывізацыя, створаны калгас імя Шверніка. З 1948 года прыняла вучняў сярэдняя школа. У 1955 годзе адкрыўся агароднінасушыльны завод. А яшчэ праз чатыры гады, 8 жніўня 1959 года, Гарадзец быў уключаны ў склад Кобрынскага раёна.

У студзені 1946 года намаганнямі мясцовага фельчара Паўла Чэрніка ў Гарадцы з'явілася бальніца. Спачатку яна складалася з дзвюх палат, шасці ложкаў, крыху пазней адкрылася радзільнае аддзяленне. У бальніцы няпросты лёс: у розныя гады яе зачынялі, адчынялі, пераўтворвалі ў фельчарска-акушэрскі пункт, амбулаторыю. У 1979 годзе ў будынку былой школы была адчынена бальніца на 40 ложкаў. Новае аблічча яна набыла пасля рэканструкцыі ў 2008 годзе.

У 1970 годзе ў вёсцы налічвалася 411 двароў.

Бурнае будаўніцтва разгарнулася ў Гарадцы ў 80-90 гады XX стагоддзя. Так, у 1983 годзе быў пабудаваны комплекс па адкорме буйной рагатай жывёлы. У 1986 годзе ўзведзены пасёлак з двух- і трохпавярховымі дамамі для жывёлаводаў. Гэта зараз вуліцы Гомельская, Садовая, Лугавая, Кветкавая і Працоўная. У 1993 годзе пушчана новая АТС. У 1994 годзе ў Гарадцы налічвалася 509 жылых двароў і пражывала 1515 чалавек, яшчэ 350 чалавек пражывала ў новым пасёлку, пабудаваным у свой час спецыяльна для работнікаў калгаса імя Ф. Дзяржынскага, пазней пераназванага ў ААТ «Гарадзец-агра».

На 1996 год у вёсцы налічвалася 560 двароў.



На 1 студзеня 1999 года ў вёсцы 574 двары, 1438 жыхароў, будынкі выканкама сельсавета і адміністрацыі калгаса-камбіната імя Ф. Дзяржынскага. У 1977 годзе каля будынка ўстаноўлены бюст Фелікса Дзяржынскага. Працавалі ў вёсцы клуб, бальніца, кафэ, сярэдняя школа, дзіцячы сад, амбулаторыя, аптэка, бібліятэка, магазін, бытавы камбінат у якім знаходзілася швейнае атэлье і майстэрня па рамонце абутку.

# Сімволіка малой радзімы

Сімволіка, як гістарычная памяць і памяць увогуле, – рэчы незнішчальныя. Геральдычныя сімвалы займаюць адно з галоўных месцаў сярод каштоўнасцей гістарычнай спадчыны і культурна-маральных арыенціраў сённяшняга дня.

Гісторыя геральдычных сімвалаў у кожнага населенага пункта свая. Ёсць яна і ў вёсцы Гарадзец Кобрынскага раёна.

Гісторыя гарадзецкага герба бярэ адлік з 1589 года, калі Кобрын і Гарадзец па прывілею польскага караля і вялікага князя Літоўскага атрымалі права на самакіраванне па ўзоры магдэбургскага права. Для двух горадоў быў зацверджаны адзіны орган самакіравання і герб, на якім былі намаляваны Ісус Хрыстос з Багародзіцай і святая Ганна. Як даказаў літоўскі даследчык Эдмундас Рымша, пячаткі для афіцыйных дакументаў выраблялiся асобна для Гарадца і асобна для Кобрына. Адрозненняў на пячатках было мінімальна, таму часам абмяжоўваліся надпісамі.

10 снежня 1589 года Кобрын і Гарадок (сучасная назва Гарадзец) атрымалі права карыстацца адным і тым жа гербам. Гэта ўвогуле адзіны для Беларусі выпадак, калі два гарады мелі адзін супольны магістрат, ужывалі агульную пячатку з адным гербам. Гэты факт тлумачыцца тым, што абодва горада знаходзіліся ва ўладанні каралевы Ганны Ягелонкі. Пляменнік каралевы, кароль Жыгімонт ІІІ Ваза, у яе гонар і надаў ім герб з выявай святой Ганны. Пазней герб быў пацверджаны наступнымі каралямі.

На гербе Гарадца былі адлюстраваны выявы дзвюх жаночых постацей у сярэбраным полі: святых Ганны і Марыі з немаўляткам Ісусам на руках. Гэты рэлігійны сюжэт, які атрымаў у каталіцкай іканаграфіі назву «Святая Ганна ўтрох», шырока распаўсюджаны ў заходне-еўрапейскім жывапісу эпохі Адраджэння.



Выявы на пячатках з гербам Гарадца былі не аднолькавыя: персанажы адрозніваліся па памерах і размяшчэнні. Так, на пячатках 1589 года фігура святой Ганны была самай вялікай, а астатнія персанажы сядзяць у яе на каленях.

Пры аднаўленні гістарычнага герба ўзяты за аснову прывілей 1662 года, які захоўваецца ў аддзеле Рукапісаў Бібліятэкі Акадэміі навук Літвы і ў якім усе фігуры намаляваны ў сядзячым стане. Аўтары рэканструкцыі, якая запатрабавала карпатлівай даследчай працы, пачынаючы з 1999 года, дайшлі да высновы, што справа на ім намалявана Багародзіца, злева - святая Ганна. Іх вывад пацвярджаўся палажэннем Ісуса Хрыста, які нібы пачынае рух ад сваёй маці ў бок святой Ганны.



Аўтары рэканструкцыі герба І. А. Шпунт і Ю. Г. Лявіцкі. У такой ізаграфіі герб і сцяг былі адобраны рашэннем Гарадзецкага сельскага выканаўчага камітэта ад 27 ліпеня 2006 года № 116.

У сучасным гербе вёскі Гарадзец адноўлены гістарычны сюжэт і прыменены тыя ж прынцыпы, што і на гербе Кобрынскага раёна.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 659 ад 2 снежня 2008 года «Аб установе афіцыйных геральдычных сімвалаў адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак Брэсцкай вобласці» былі афіцыйна зацверджаны геральдычныя сімвалы вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна, Палажэнне аб гербе і сцяге, іх апісанне. Зарэгістраваны гэтыя геральдычныя сімвалы ў Гербавым матрыкуле Рэспублікі Беларусь № Б-140 ад 23 студзеня 2009 года.

*Афіцыйнае апісанне герба вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна*



Герб вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна з'яўляецца яе афіцыйным геральдычным сімвалам.

Герб вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна – уласнасць Гарадзецкага сельсавета, правам распараджэння якой валодае Гарадзецкі сельскі выканаўчы камітэт.

Выява герба вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна размяшчаецца на будынках органаў улады і шэрагу дзяржаўных устаноў, унутры службовых кабінетаў іх кіраўнікоў.

Выява герба вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна можа размяшчацца ў тых месцах Гарадзецкага сельсавета, дзе ў адпаведнасці з заканадаўствам прадугледжваецца размяшчэнне выявы Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, таксама можа выкарыстоўвацца падчас дзяржаўных святаў і святочных дзён, урачыстых мерапрыемстваў, якія праводзяцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі, народных, працоўных, сямейных святаў і мерапрыемстваў, прыстасаваных да памятных дат.

*Апісанне герба вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна*

Герб вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна прадстаўляе сабой барочны шчыт, у сярэбраным полі якога намаляваны немаўля Ісус Хрыстос у сярэбраным адзенні, які стаіць на каленях Прычыстай Дзевы Марыі, убранай у адзенне чырвонага колеру паверх

зялёнага хітона, і святая Ганна ў блакітных адзеннях з сярэбраным пакрывалам на галаве, якая трымае немаўля за руку; над іх галовамі - залатыя німбы.

*Афіцыйнае апісанне сцяга вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна*



Сцяг вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна з'яўляецца яе афіцыйным геральдычным сімвалам. Сцяг вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна – уласнасць Гарадзецкага сельсавета, правам распараджэння якой валодае Гарадзецкі сельскі выканаўчы камітэт.

Сцяг вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна размяшчаецца на будынках органаў улады і самакіравання Гарадзецкага сельсавета, а таксама ў памяшканнях пасяджэнняў гэтых органаў і службовых кабінетах іх кіраўнікоў.

Сцяг вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна можа размяшчацца ў тых месцах Гарадзецкага сельсавета, дзе ў адпаведнасці з заканадаўствам прадугледжваецца размяшчэнне Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.

Сцяг вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна можа выкарыстоўвацца таксама падчас дзяржаўных святаў і святочных дзён, урачыстых мерапрыемстваў, якія праводзяцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі, народных, працоўных, сямейных святаў і мерапрыемстваў, прыстасаваных да памятных дат.

*Апісанне сцяга вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна*

Сцяг вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна прадстаўляе сабой прамавугольнае палотнішча блакітнага колеру з суадносінамі бакоў 1:2, у цэнтры якога размешчана выява герба вёскі Гарадзец Кобрынскага раёна.

Безумоўна, сімвалы малой радзімы напоўнены глыбокім сэнсам і могуць расказаць пра яе гісторыю. Гэта сімвалы пераемнасці, якія надаюць сілу і духоўную агульнасць.

# Вёска мовай статыстыкі







## ДЭМАГРАФІЯ

**У розны час насельніцтва в. Гарадзец складала:**

*1566 год* — звыш 193 гаспадарак (паводле даследаванняў Ю. А. Якімовіча, 205 двароў);
*1792 год* — 500 чал.

***XIX стагоддзе***:
*1830 год* — 360 муж., з іх шляхты 35, духоўнага стану 3, мяшчан-юдэяў 156, мяшчан-хрысціянаў і сялянаў 166;
*1878 год* — 1264 чал.;
*1886 год* — 1331 чал;
*1891 год* — 1559 чал.;
*1897 год* — 1691 чал.

***XX стагоддзе***:
*1905 год* — 2949 чал.;
*1921 год* — 688 чал.;
*1940 год* — 1153 чал;
*1970 год* — 1356 чал;
*1977 год* — 1162 чал.;
*1980 год* — 1098 чал.;
*1981 год* — 1052 чал.;
*1982 год* — 1173 чал.;
*1983 год* — 1162 чал.;
*1984 год* — 1193 чал.;
*1985 год* — 1251 чал.;

*1986 год* — 1262 чал.;
*1987 год* — 1319 чал.;
*1988 год* — 1443 чал.;
*1989 год* — 1592 чал.;
*1993 год* — 1516 чал.;
*1994 год* — 1452 чал.;
*1995 год* — 1478 чал.;
*1996 год* — 1449 чал.;
*1997 год* — 1450 чал.;
*1998 год* — 1456 чал;
***1999 год* — 1438 чал.**

***XXI стагоддзе***:
*2000 год* — 1409 чал.;
*2001 год* – 1420 чал.;
*2002 год* — 1396 чал.;
*2003 год* — 1369 чал.;
*2004 год* — 1358 чал.;
*2005 год* — 1362 чал;
*2006 год* — 1386 чал.;
*2007 год* — 1357 чал.;
2008 *год* — 1349 чал.;
***2009 год* – 1272 чал., сярод іх мужчын – 608, жанчын - 664**
*2010 год* — 1416 чал.;
*2011 год* – 1396 чал.;
*2012* год —1398 чал.;
*2013* год — 1402 чал.;
*2014* год — 1377 чал.;
*2015* год — 1358 чал.;
*2016 год* — 1376 чал.;
*2017 год* -— 1375 чал.;
*2018 год* — 1348 чал.;
***2019 год* — 1306 чал., з іх маладзей працаздольнага ўзросту – 228, працаздольнага ўзросту – 806, старэйшых за працаздольны ўзрост - 272;**
*2020 год* — 1299 чал.;
*2021 год* — 1296 чал.



# Прыказкі, прымаўкі з Гарадца

- Каб навучыцца плаваць, трэба лезці ў ваду.
- Без навукі няма і ўменння.
- Справа майстра баіцца.
- Не іголка шыя, а рукі.
- У неўмелага рукі не баляць.
- Што напісана пяром, тое не вырубіш тапаром.
- Багаццем ума не купіш.
- Калі лізаць чарніла, вучоным не станеш.
- Хто хоча больш ведаць, таму трэба менш спаць.
- Не памучышся – не навучышся.
- Не навучыўшыся і лапці не сплящеш.
- Паважай настаўніка, як бацьку ці маці.
- Строгасць настаўніка карысней ласкі бацькоў.
- Мала жадаць – трэба умець.
- На беразе плаваць не навучышся.
- Вопыт – самы лепшы наставнік.
- Вучоны без працы, як хмара без дажджу.
- У пустой бочцы больш грукату.
- Які розум, такая і мова.
- Вучыся з моладу - пад старасць не будзеш ведаць голаду.
- Дрэннаму танцору і башмакі мяшаюць.
- Розум добра, а два лепш.
- У навуцы старых няма.
- Не вучыся рушыць, а вучыся будаваць.
- Вучыцца ніколі не позна.
- Чаму з моладу не навучыўся, тое і пад старасць ведаць не будзеш.
- Без граматы, як без свечкі, упацёмках.
- Грамаце вучыцца – заўседы прыгадзіцца.
- Бачыць вока далека, а розум яшчэ далей.
- Язык да Кіева даведзе.
- Сустракаюць па адзенню, а праважаюць па розуму.
- Не пяром пішуць, а розумам.
- Розум і грошы не заменяць.
- Розум на рынку не купіш.
- Разумны гаспадар летам марыць аб зіме.
- Разумны не той, хто многа гаворыць, а той хто многа ведае.
- У разумнай галавы сто рук.
- Калі топішся, то і за саломіну схопішся.
- Беражонага і бог беражэ.
- Калі топішся, то і за брытву схопішся.
- Не гавары гоп, пакуль не пераскочыш.
- Лянівы заўсёды не ўмее.

# Сучасны імідж старажытнага Гарадца: *пейзажы вясковыя - умовы гарадскія*




У 2008 годзе Гарадзец атрымаў статус аграгарадка. Населены пункт уваходзіць у склад аднайменнага сельскага савета і размешчаны за 22 км на ўсход ад Кобрына і за 68 км на ўсход ад Брэста на аўтатрасе Кобрын — Гомель. Чыгуначная станцыя на лініі Брэст – Гомель.




Сучасны і прывабны імідж мае Гарадзецкі аграгарадок. На сённяшні час у аграгарадку пражывае 1286 жыхароў (2022). Грандыёзныя перамены адбыліся, калі была прынята Праграма адраджэння і развіцця сяла на 2005-2010 гады.





У межах ажыццяўлення Дзяржаўнай праграмы створана неабходная сацыяльна-бытавая інфраструктура. Прыведзены ў належны стан аб’екты аховы здароўя, адукацыі, культуры, гандлю, бытавога абслугоўвання, паштовай сувязі, пад’езды да малочнатаварных ферм і машынных двароў. Пабудавана шмат жылых дамоў, радуе вока прыватная забудова.




Функцыянуюць аддзяленне сувязі, аддзяленне ААБ «Беларусбанк». Адрамантаваны і прыведзены ў належны стан новыя сеткі водазабеспячэння, добраўпарадкаваны і заасфальтаваны дарогі, устаноўлены новыя ліхтары вулічнага асвятлення і 6000 пагонных метраў жалезабетоннай агароджы.




Сяльчанам аказваецца комплексная, якасная медыцынская дапамога ў рэканструяванай у 2008 годзе ***Гарадзецкай участковай бальніцы***.



Штат укамплектаваны патрэбнай колькасцю спецыялістаў. Матэрыяльна-тэхнічная база бальніцы прадстаўлена неабходным абсталяваннем, каб ажыццяўляць комплекс лячэбна-прафілактычных мерапрыемстваў. Цяпер бальніца разлічана на 25 ложкаў, аказвае шырокі пералік бясплатных паслуг: тут можна здаць аналізы, зрабіць УГД унутраных органаў, кардыяграму, наведаць стаматолага, атрымаць шэраг фізіяпрацэдур. Гарадзецкая бальніца ўключае ў сябе стацыянарнае і амбулаторнае аддзяленні. Для зручнасці людзей працуе аптэчны кіёск.




Пастаянна ўдасканальваецца сацыяльная абарона грамадзян. Штогадова праводзяцца абследаванні ветэранаў, інвалідаў, прымаюцца неабходныя меры па аказанні адраснай сацыяльнай дапамогі.

Развіваецца і гандлёвая сетка. Ніколі не пустуе магазін Кобрынскага райспажыўтаварыства ў Гарадцы. Таксама ў аграгарадку функцыянуюць магазіны групы кампаній «Нашы вытокі», «Хіт»; кафэ «Утульнасць», у якім кожнага кліента чакаюць смачная ежа і выдатны настрой.

















У Гарадцы ёсць усё, што належыць аграгарадку па статусе.

Ёсць тут і цырульня, сама назва якой гаворыць за сябе - «Прыгажуня». Вопытны цырульнік робіць жаночыя, мужчынскія, класічныя і па індывідуальнай дамоўленасці прычоскі.

# Патрыётаў выхоўваюць з дзяцінства

## *«Гарадзецкі дзіцячы сад - сярэдняя школа»*




У дзяржаўнай установе адукацыі «Гарадзецкі дзіцячы сад - сярэдняя школа» займаюцца 191 вучань і 50 выхаванцаў дзіцячага сада ў трох групах, функцыянуюць ваенна-патрыятычны і краязнаўчы музеі.

Гісторыя школы бярэ свой пачатак у далёкім 1900 годзе, калі ў Гарадцы была пабудавана пачатковая школа. Яна складалася з чатырох класаў, усяго займалася 65 чалавек. Працаваў адзін настаўнік.



У канцы 1914 года школа з пачатковай аднакласнай ператварылася ў двухкласную пачатковую. У час Першай сусветнай вайны многія жыхары выязджалі з Гарадца, таму школа на час прыпыніла сваю работу.

Пры панскай Польшчы, пачынаючы з 1920 года, школа стала сямікласнай. У 1938 годзе быў пабудаваны новы будынак школы (цяпер там размешчана бальніца), і заняткі пачаліся 1 кастрычніка 1939 года. У гэты час дырэктарам быў Якаў Фёдаравіч Чэрнік.

Падчас нямецкай акупацыі школа пераўтворана гітлераўцамі ў штаб, сцены самога будынка абкладзены зямлёй, замініраваны. Многія настаўнікі і работнікі школы пайшлі на фронт. Пасля вызвалення Гарадца заняткі аднавіліся 1 верасня 1944 года. Па-ранейшаму было 7 класаў. У 1947 годзе адбыўся першы выпуск за курс сямігадовай школы.

У 1947 годзе школе нададзены статус сярэдняй. У 1950 годзе быў першы выпуск за курс сярэдняй школы. З 1974 года школа размяшчаецца ў былым будынку школы-інтэрната.



У 2008 годзе школа рэарганізавана ў дзяржаўную ўстанову адукацыі «Гарадзецкі дзіцячы сад - сярэдняя школа». Педкалектыў узначальвае дырэктар Аляксандр Міхайлавіч Валасевіч. Працуе 35 настаўнікаў, сярод якіх шэсць з вышэйшай катэгорыяй, 23 – з першай.

З 2013 года ў сувязі з аптымізацыяй сеткі ўстаноў адукацыі Кобрынскага раёна ў школе працягваюць навучанне вучні Аніскавіцкай сярэдняй школы, з 2014 года навучэнцы Грушаўскага дзіцячага сада - базавай школы.



Прыярытэтным напрамкам работы з'яўляецца грамадзянска-патрыятычнае выхаванне і краязнаўчая работа.

У краязнаўчым музеі, які быў створаны ў 2004 годзе, захоўваецца гісторыя вёскі. Школьны музей — гэта тры вялікія музейныя пакоі. Спачатку экспанаты размяшчаліся ў адным пакоі, потым з’явіўся пакой баявой славы (2005). Апошнім быў аформлены этнаграфічны пакой (2007).

Дарэчы, у 2016 годзе музей атрымаў званне народнага і з’яўляецца сапраўдным цэнтрам краязнаўства і патрыятызму.



Экспазіцыі музея прысвечаны гісторыі, культуры і традыцыям вёсак сельсавета, выдатным землякам. Асобна дэманструюцца дэкаратыўныя вырабы вучняў. Экспанаты юныя краязнаўцы і педагогі збіралі па навакольных вёсках, хутарах. Кіраўніцтва ААТ «Гарадзец-агра» дапамагло сродкамі на афармленне экспазіцый.

У музеі знаходзяцца рэдкія артэфакты: старажытныя прылады працы (крамянёвыя нажы, каменныя сякеры і іншае), човен XVIII стагоддзя, дакументы аб будаўніцтве Каралеўскага канала, кнігі вядомай польскай пісьменніцы Марыі Радзевіч, шмат іншых прадметаў, якія адлюстроўваюць гісторыю мінуўшчыны і сучасны стан Гарадца. Сабрана багатая нумізматычная калекцыя.

На стэндзе ганаровых жыхароў — фотаздымкі заслужаных настаўніцы Ганны Сташэўскай, фельчара Ганны Шаўчук, работніка культуры Ігара Чэрніка, перадавых

хлебаробаў, жывёлаводаў, рабочых прамысловых прадпрыемстваў, размешчаных на тэрыторыі сельсавета. Сабраны матэрыялы пра шляхетную зямлячку Марыю Радзевіч.

Школьнікі сабралі ўнікальны матэрыял пра мужную барацьбу землякоў з нямецка-фашысцкімі акупантамі на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскіх атрадах. Акрамя ваенных лістоў, рэштkaў зброі тут захоўваецца і багатая картатэка жыхароў Гарадзецкага сельсавета, якія загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны. Картатэка — вынік карпатлівай пошукавай работы настаўнікаў і вучняў.





У цэнтры пакоя баявой славы — фотапартрэты і асабістыя рэчы выпускнікоў школы воінаў-інтэрнацыяналістаў Мікалая Дземідовіча і Канстанціна Тунчыка, якія загінулі ў Афганістане.

Пры музеі працуюць пошукава-даследчыя групы «Пошук» і «Мая Кобрыншчына». Членамі гэтых груп сабраны артэфакты Вялікай Айчыннай вайны, матэрыялы аб 13 земляках, якія ваявалі ў Дэмакратычнай Рэспубліцы Афганістан.



У экспазіцыі «Беларуская хатка» прадстаўлены інтэр'ер жылля і побыт жыхароў Гарадца 1950-х гадоў (ложак, калыска, люлька, куфар, печ, посуд).



Музейныя зборы змяшчаюць багаты матэрыял аб мясцовых народных майстрах. Адметнай асаблівасцю дзейнасці ўстановы з'яўляецца рэгулярнае правядзенне выставак вырабаў народнага і дэкаратыўна-прыкладнога

мастацтва навучэнцаў і жыхароў Гарадца «Мір маіх захапленняў».




Вучні школы пастаянна ўдзельнічаюць у краязнаўчых мерапрыемствах рэспубліканскіх акцый і дабіваюцца высокіх вынікаў, пра што сведчаць шматлікія ўзнагароды. Так, Маргарыта Данілевіч у конкурсе творчых работ «Дакументальны сведка вайны» стала пераможцай раённага, абласнога і рэспубліканскага этапаў і ўзнагароджана дыпломамі I ступені.




Навуковыя даследаванні вучняў пастаянна трапляюць у лік лепшых на рэспубліканскіх конкурсах.

Шматлікія музейныя экспанаты ўстановы, не проста знаходзяцца там - яны працуюць, абуджаючы ў юных вяскоўцах жывую цікавасць да сваёй мінуўшчыны.

… Ёсць у Гарадцы ***векавыя дрэвы***. Адно з іх - школьны дуб. Вышыня дуба каля 23 метраў. Магутны ствол у метры ад зямлі складае 4,6 метры ў акружнасці, і тры дарослыя чалавекі, узяўшыся за рукі, не могуць яго абхапіць.

Старажылу не менш за 500 гадоў. Ён многае пабачыў і, напэўна, змог бы расказаць сотні сюжэтаў з жыцця вёскі…



# Культурны цэнтр аграгарадка

Культурны цэнтр аграгарадка Гарадзец – гэта ўстановы ***«Гарадзецкая публічная бібліятэка-філіял»*** і ***«Гарадзецкі клуб»***. Супрацоўнікі культустаноў прадстаўляюць сваю вёску адзіным калектывам, сумесна праводзяць культурна-асветніцкую работу сярод жыхароў.



Бібліятэчны фонд ***Гарадзецкага філіяла*** налічвае больш за 12 000 экз. выданняў, у тым ліку і электронных дакументаў. Да паслуг карыстальнікаў 24 перыядычныя выданні: 6 найменняў газет і 18 найменняў часопісаў.

Набыццё камп'ютара, прынтара, выхад у інтэрнэт дазволілі стварыць камфортныя ўмовы для карыстальнікаў бібліятэкі і разнастаіць сэрвіс платных паслуг. Усяго насельніцтву ў бібліятэцы аказваецца 14 відаў платных паслуг.

Функцыянуе ў бібліятэцы аматарскі дзіцячы клуб «Брыганціна». У каардынацыі са школай праводзіцца масава-асветніцкая работа сярод дзяцей і падлеткаў. Але бібліятэка









не абмяжоўваецца толькі абслугоўваннем чытачоў і правядзеннем для іх масавай работы, вядзецца арганізацыйная работа па правядзенню культурнага досуга ўсяго насельніцтва зоны абслугоўвання, асабліва моладзі.





У 2019 годзе Гарадзецкая публічная бібліятэка была ўзнагароджана Граматай Беларускага Экзархата за І месца ў рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка - цэнтр духоўнай асветы і выхавання» ў намінацыі





«Сям'я - спадчынніца маральных і духоўных каштоўнасцей». Супрацоўніцтва Гарадзецкай бібліятэкі з праваслаўнай Узнясенскай царквой працягваецца не адзін год. Адной з найважнейшых задач у духоўна-маральным







выхаванні жыхароў аграгарадка бібліятэкары і настаяцель царквы іерэй Георгій Чарвякоўскі лічаць інфармацыйна-пазнавальную дзейнасць.

Гарадзецкая публічная бібліятэка-філіял знаходзіцца ў пастаянным пошуку новых і цікавых форм работы, імкнецца задаволіць запыты і патрэбы чытачоў, спрыяць іх адукацыі, самавыхаванню.

Цэнтр творчасці, адпачынку і сустрэч у аграгарадку, зразумела, ***Гарадзецкі клуб***. Пры клубе функцыянуюць народны ансамбль песні, танцавальны і вакальны гурткі, гурток мастацкага слова. Дзейнічае тут і жаночы клуб «Алёнушка», праводзяцца дыскатэкі.

Гаворачы пра народны ансамбль песні, трэба адзначыць, што калектыў удзельнікаў невялікі, аднак мабільны. Самадзейныя артысты актыўна вядуць канцэртную дзейнасць - у сваім сельсавеце выступілі з канцэртамі ва ўсіх вёсках, выступаюць таксама на розных пляцоўках раёна. З задавальненнем адклікаюцца і на прапановы падзяліцца творчасцю з мясцовымі рупліўцамі сельскагаспадарчай нівы. У гарачы час жніва, у абедзенныя перапынкі, яны добрымі песнямі вітаюць удзельнікаў уборачнай кампаніі, ухваляючы адвечную хлебаробскую працу.





Прытрымліваюцца тут каляндарных свят - як царкоўных, так і свецкіх. Каляды, Масленіца, 8 Сакавіка, Дзень Перамогі, Дзень моладзі, Купалле і шмат іншых сталі традыцыйнымі гарадзецкімі мерапрыемствамі.

Супрацоўнікі бібліятэкі і клуба робяць усё магчымае, каб установы



культуры сталі неад'емнай часткай жыцця жыхароў вёскі. А жыхары не толькі з задавальненнем прыходзяць на мерапрыемствы, якія арганізоўваюць клуб і бібліятэка, але і актыўна ў іх удзельнічаюць.

# ААТ «Гарадзец-агра» — буйнейшая гаспадарка Кобрыншчыны

ААТ «Гарадзец-агра» - буйнейшая гаспадарка ў Кобрынскім раёне, якая спецыялізуецца на вытворчасці малака і мяса. Гаспадарка раскінулася ў радыусе 40 кіламетраў і займае ледзь не палову тэрыторыі раёна. Агульная зямельная плошча арганізацыі складае 21 872 гектары, плошча сельгасугоддзяў — 15 465 гектараў, ворыва — 8 657 гектараў. Гаспадарку дзеліць на дзве часткі Дняпроўска-Бугскі канал. На супрацьлеглым беразе знаходзіцца былы калгас «Аніскавічы», які далучылі да акцыянернага таварыства і дзе налічваецца 2 000 гектараў зямлі. Тут утрымліваецца і грамадскі статак: дойныя каровы, маладняк на дарошчванне і папаўненне. Усяго — каля паўтары тысячы буйной рагатай жывёлы. Цераз канал наладжана паромная пераправа, па якой дастаўляюцца тэхніка, людзі, кармы для жывёлы.

Вялікія плошчы патрабуць маштабнай работы, таму аграрыі не лічачыся з часам, нястомна працуюць. Што стаіць за кожнай тонай нарыхтаваных кармоў, за атрыманым кілаграмам збожжа, за кожным апрацаваным гектарам глебы кіраўніцтва гаспадаркі добра ведае, таму за лепшыя паказчыкі ўшаноўвае сваіх рупліўцаў на працягу ўсяго сельска-гаспадарчага года.



Збожжасушыльная ўстаноўка

Мясцовыя жыхары з гонарам працуюць на зямлі. На сучасным этапе ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Гарадзец-агра» працуе амаль 400 чалавек, сярэдні заробак — 983 рублі.

Тут актыўна разіваюцца мясамалочны напрамак і раслінаводства. Усяго ў гаспадарцы функцыянуюць дзесяць малочнатаварных фермаў, малочнатаварны комплекс і комплекс па адкорме буйной рагатай жывёлы.




Пільная ўвага надаецца развіццю адпаведнай вытворчай інфраструктуры. У гаспадарцы пабудаваны малочнатаварны комплекс у в. Гарадзец на 1000 галоў. Пасля праведзенай мадэрнізацыі ўведзена ў эксплуатацыю малочнатаварная ферма, разлічаная на 700 галоў. Тут устаноўлена айчыннае даільнае абсталяванне «Унібокс», створаны годныя сацыяльна-бытавыя ўмовы для персаналу – функ-

цыянуюць душавыя, раздзявалкі. Штат укамплектаваны вопытнымі работнікамі. Пастаянна вядзецца рэканструкцыя на фермах, будуюцца новыя памяшканні, клюшачнікі,



кароўнікі, прычым за асабістыя сродкі. У 2021 годзе ўвялі ў строй першую чаргу малочнатаварнай фермы «Старадубцы», дзе размясцілі 450 галоў дойнага статка. Новая МТФ «Старадубцы» — не толькі сучасныя тэхналогіі ў вытворчасці малака, але і камфортныя ўмовы працы людзей.



Дынамічна развіваецца і раслінаводства. У ААТ «Гарадзец-агра» атрымліваюць годныя ўраджаі збожжавых і зернебабовых культур, рапсу, цукровых буракоў, кукурузы на



сілас, шматгадовых траў. У гаспадарцы высокая культура земляробства.

Кожны год за кошт абаротных сродкаў і крэдытных банкаўскіх рэсурсаў абнаўляецца матэрыяльна-тэхнічная база. У распараджэнні гаспадаркі - неабходная колькасць трактароў «МТЗ» і «Джон Дзір», пасяўных агрэгатаў. Набыты апырск-



вальнік «Раса» са спецыяльнымі шынамі нізкага ціску павышанай праходнасці на любых глебах, які ажыццяўляе падкормку комплекснымі ўгнаеннямі азімых культур.

Спецыялісты ААТ «Гарадзец-агра» праводзяць тэхнічнае абслугоўванне і сезонныя рамонты на высокім арганізацыйным узроўні, якасна і ў тэрмін. Гаспадарка ў поўнай меры забяспечана гаруча-змазачнымі матэрыяламі і запаснымі

часткамі да тэхнікі, праводзіцца яе мадэрнізацыя.





Разам з вопытнымі спецыялістамі, якія не першы год працуюць на гэтай зямлі, дружна шчыруе і моладзь. Прыехаўшы аднойчы ў гаспадарку на адпрацоўку, многія маладыя спецыялісты засталіся тут надоўга, некаторыя стварылі сем'і. Моладзь заўважае, што ўмовы для пражывання ў іх добрыя – усіх жадаючых гаспадарка забяспечыла жыллём. Адчуваюць яны як добрую падтрымку з боку старэйшых калег, якія заўсёды гатовы падзяліцца вопытам, так і матэрыяльную ў выглядзе выплат





як маладым спецыялістам. З упэўненасцю можна канстатаваць, што ААТ «Гарадзец-агра» - лідар па маладых кадрах у Кобрынскім раёне. Маючы ў кадравым арсенале добра падрыхтаваных спецыялістаў, гаспадарка з году ў год паспяхова выконвае ўсе тэхніка-эканамічныя паказчыкі.

Дарэчы, у ААТ «Гарадзец-агра» выпрацавана дакладная сістэма падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, пачынаючы са школьнай лаўкі. Найлепшым вучням устаноў адукацыі Гарадзецкага сельсавета адміністрацыя выплачвае грашовыя прэміі, якія ўручаюцца ва ўрачыстай абстаноўцы на школьных лінейках. Гэта стымулюе іх да выдатнай вучобы, а ў далейшым, магчыма, і да работы ў гаспадарцы. Разам з тым партрэты перадавікоў таварыства змешчаны не толькі на Дошцы гонару на цэнтральнай сядзібе, але і на стэндзе ў Гарадзецкім дзіцячым садзе-сярэдняй школе. Так захоўваецца пераемнасць пакаленняў.

Гонар гаспадаркі - працоўныя дынастыі, ветэраны і сённяшнія спецыялісты, якія застаюцца вернымі калектыву, яго лепшым традыцыям. Дзякуючы створаным спрыяльным умовам у Гарадцы вось ужо шмат гадоў існуе добрая традыцыя сямейных працоўных дынастый - будучыні, надзеі і апоры любой вёскі.

Праблем з жыллём у аграгарадку няма ніякіх. Будуюцца дамы для спецыялістаў, паляпшаюцца жыллёвыя ўмовы, спраўляюцца наваселлі. Кожны год моладзь імкнецца замацавацца на сяле. Адміністрацыя гаспадаркі актыўна гэтаму спрыяе. Нібыта грыбы пасля дажджу, растуць у цэнтральнай сядзібе жылыя кварталы. У асноўным тут пражываюць маладыя сем'і з дзецьмі.



*32-х кватэрныя дамы ў аг. Гарадзец*



*Прэзідэнцкія домікі аг. Гарадзец*

# Гарадзец шматканфесійны

Святлом і цяплом асвятляе сваіх прыхаджан ***Свята-Узнясенскі храм***, які ўзвышаецца ў цэнтры вёскі, на пагорку. Узнясенская царква - галоўная славутасць аграгарадка Гарадзец, гісторыка-культурная каштоўнасць, помнік драўлянага дойлідства.



Пабудавана царква ў 1799 годзе ў вёсцы Камень Шляхецкі (сёння в. Акцябр) з дрэва. Некаторы час будынак выкарыстоўвалася як уніяцкі храм, а пасля 1839 года быў пераабсталяваны ў праваслаўны. У 1876 годзе перавезены ў мястэчка Гарадзец і пастаўлены на бутавы падмурак. З таго часу храм ніколі не закрываўся.

Пераломным момантам у гісторыі храма быў 1921 год, калі Гарадзец стаў цэнтрам гміны Палескага ваяводства. Свята-Узнясенскі храм на той час адзіны праваслаўны храм у паселішчы.

З 1939 года Свята-Узнясенскі прыход пачынае дзейнічаць у новых умовах атэістычнай дзяржавы. Настаяцелем храма ў той час з'яўляўся святар Аляксандр Лявіцкі, прызначаны на парафію яшчэ ў 1936 годзе.



*Яўгеній Парфянюк*

У 1952 годзе святаром у Гарадзец быў прызначаны Яўгеній Парфянюк, які здзяйсняў сваё служэнне ў Гарадцы да 1957 года.

З 1957 года настаяцелем царквы ў Гарадцы стаў айцец Аляксандр Валасюк, якога змяніў святар Гаўрыіл Ліпко.



*Святар Гаўрыіл Ліпко. Фота з асабістага архіва Яўгенія Жука*

У 1985 годзе свяшчэннікам у Гарадзецкай царкве становіцца протаіерэй Васілій Сярэдзін. За час яго служэння быў зроблены касметычны рамонт храма, часткова распісаны столь і сцены. Былі арганізаваны першыя заняткі нядзельнай школы (першыя заняткі праходзілі непасрэдна ў храме). Пачата будаўніцтва храма ў гонар Свяціцеля Дзімітрыя Растоўскага.

У 2009 годзе настаяцелем парафіі быў прызначаны іерэй Георгій Чарвякоўскі, які служыць і па сённяшні дзень. Быў асвячоны храм Свяціцеля Дзімітрыя Растоўскага, устаноўлены новыя абразы ў алтары і на іканастасе, рэстаўравана копія Пачаеўскай Іконы Божай Маці, абсталяваны будынак нядзельнай школы, дзе пачалі праходзіць рэгулярныя заняткі Закона Божага ў дзвюх групах.



*Копія цудатворнай Пачаеўскай іконы Божай Маці*

*Архітэктурныя асаблівасці храма*

Храм вырашаны працяглым чатырохсценным зрубам пад двухсхільным гонтавым дахам, які над пяціграннай апсідай за кошт застрэшкаў пераходзіць у вальмавы. Складаецца з моцна выцягнутага прамавугольнага асноўнага зруба з унутраным бабінцам-нартэксам і пяцірграннага алтарнага. Зрубы накрыты агульным двухсхільным дахам з падоўжным вільчыкам, з вальмамі над алтаром і невялікімі трохвугольнымі застрэшкамі ў месцы далучэння зрубаў. Па цэнтры даху ўзведзены фігурны трохярусны васьмігранны купал. Плоскасны франтальны фасад завершаны трохвугольным вертыкальна ашаляваным франтонам з з двума маленькімі дахавымі вокнамі.



*Гарадзец. Вазнясенская царква. Агульны выгляд і план*

Уваход вылучаны двухсхільным навесным ганкам на двух слупах. Вертыкальна ашаляваныя бакавыя фасады рытмічна расчлянёны высока ўзнятымі прамавугольнымі аконнымі праёмамі ў разных ліштвах і бусамі-сцяжкамі ў прасценках. Сцены ў інтэр’еры дэкарыраваны арнаментальным фрызам. Вокны прамавугольныя з сандрыкамі на фігурных кранштэйнах. Над прытворам у залу адкрываюцца хоры.

Іканастас створаны ў 1867 годзе паводле праекта інжынера Кадрунцава. У інтэр'еры - дзве іконы XIX стагоддзя «Маці Божая Адзігітрыя».

Узнясенская царква з'яўляецца помнікам народнага дойлідства з элементамі барока. Царква ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Акрамя Узнясенскага храма, у Гарадцы ёсць яшчэ адна праваслаўная царква – ***у гонар Святога Дзімітрыя, мітрапаліта Растоўскага.***



Храм пабудаваны на ўзвышшы, знаходзіцца на ўездзе ў Гарадзец з боку Антопаля. Мае цікавую архітэктуру, аднакупальны, выкананы з чырвонай цэглы.

Гэты праваслаўны храм пабудаваны ў XXI стагоддзі па канонах старажытнарускага стылю. Цаглінка за цаглінкай ён узводзіўся, у тым ліку пры непасрэдным удзеле ўраджэнца Гарадца, масквіча іераманаха Максіміліяна.

Аднакупальны, трохнефны і аднаапсідны храм, прызначаны для здзяйснення нядзельных багаслужэнняў у летні час, стаў сапраўдным упрыгожаннем і святыняй старажытнага Гарадца.



У храме захоўваецца абраз Свяціцеля Дзімітрыя Растоўскага з часціцай яго святых мошчаў.

Царква ўваходзіць у склад Праваслаўнай парафіі храма Свята-Узнясенскага храма. Настаяцелем з'яўляецца іерэй Георгій Чарвякоўскі.

Новы храм - яшчэ адзін прыклад развіцця вёскі. Вялікі залаты купал храма ярка зззяе пад промнямі сонца, дорыць цудоўны настрой і натхненне.

Праваслаўны храм свяціцеля Дзмітрыя Растоўскага з'яўляецца сапраўднай жамчужынай вёскі Гарадзец.

**Касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай Дзевы Марыі** быў пабудаваны ў Гарадцы ў 30-ыя гады XVIII стагоддзя. Адначасова з чым тут па пратэкцыі караля Уладзіслава IV узнікла каталіцкая епархія, якая дзейнічала да 1866 года.



У 1633 годзе кароль Рэчы Паспалітай Уладзіслаў IV Ваза зафундаваў грошы на будаўніцтва драўлянага касцёла Дабравешчання Дзеве Марыі ў Гарадцы. Верагодна, ён быў другім па ліку пасля ранейшай каталіцкай святыні, якая ўзгадвалася ў 1588 годзе.

У 1723 годзе пабудаваны барочны храм. Першапачаткова касцёл быў драўляны, у 1865-1866 католікі атрымалі будынак з цэглы. 22 кастрычніка 1866 года з прычыны малой колькасці католікаў і струхнеласці царквы, касцёл быў перададзены праваслаўным і перароблены ў царкву.

Перабудову ажыццяўлялі ў 1871 годзе вядомыя архітэктары Чэкмасаў, Кандрунцаў і Барташэўскі. Падчас рэканструкцыі з фасада былі зняты васьмігранныя шатровыя вежы, над цэнтральным рызалітам узведзена двух'ярусная васьмігранная званіца з макаўкай, якая заканчвалася шатровым васьмерыкам, а над дахам апсіды - васьміграннны шатровы барабан. Вокны мелі каляровыя вітражы. Зала пера-крывалася драўляным цыліндрычным скляпен-нем. Пластыка фасадаў набыла характэрную аркатуру, закамары, пілястравую і панэльную крапоўку. Былі ўведзены дэкаратыўныя элементы ў рэтраспектыўна-рускім стылі. Малодшы інжынер Кадрунцаў падрыхтаваў праект іканастаса.



У 1918 годзе будынак быў вернуты католікам, парафія налічвала 1080 вернікаў. Чарговая рэканструкцыя адбылася ў 1919 годзе. Адноўленаму касцёлу належала мураваная капліца ў Грушаве, фундаваная ў XIX стагоддзі радзінай Радзевічаў, а таксама драўляная капліца Святога Казіміра ў Іласку. У вопісе маёмасці за 1947 год у касцёле адзначаны 4 вялікія і 21 малы абраз, 10 вялікіх і малых крыжоў, 4 вялікія і 10 малых

скульптур, 2 канфесіяналы, 19 вялікіх і 8 малых падсвечнікаў, 1 фісгармонія, 6 рыз, 11 літургічных кніг.

У 1960-я гады мінулага стагоддзя будынак рэканструявалі пад дзіцячы дом. Цяпер касцёл істотна перайначаны і дабудаваны, выкарыс-тоўваецца як школа. Падчас прац страчаны надмагіллі Радзевічаў, якія былі пры касцёле. Па ініцыятыве пісьменніцы Марыі Радзевіч у 1933 годзе каля касцёла ўзвялі помнік аднаму з кіраўнікоў паўстання 1863 года Рамуальду Траўгуту ў выглядзе высокага крыжа з металічнай таблічкай. Паводле звестак мясцовых жыхароў, гэты крыж у верасні 1939 года спілавалі і пасеклі на дровы мясцовыя яўрэі.



Да нас дайшоў адзіны вядомы здымак фасада касцёла, зроблены ў 1931 годзе. Касцёл да нашых дзён не захаваўся. Твор архітэктуры рэтраготыкі. Быў вырашаны адзіным прамавугольным аб’ёмам. Уяўляў сабой 3-нефавую 2-вежавую базіліку з прамавугольнай апсідай і бакавымі сакрысціямі ў межах адзінай залы. Малітоўная зала трыма парамі пілонаў падзялялася на 3 нефы, уперад быў вынесены прамавугольны нартэкс.

Важнай падзеяй для каталіцкай супольнасці адзначыўся дзень 8 ліпеня 2017 года - у аграгарадку Гарадзец пры ўдзеле епіскапа Пінскага Антонія Дзям'янка прайшло ўрачыстае асвячэнне **храма рымска-каталіцкага прыхода Добрага Пастара**.



Гісторыя рэлігійнай абшчыны рымска-каталіцкага прыхода Добрага Пастара вядзе свой адлік з 2005 года, калі мясцовыя вернікі аб’ядналіся ў сваім жаданні сумесна маліцца Богу. Паступова выспела і ідэя аб стварэнні ў Гарадцы касцёла.

Непасрэдная будоўля, пасля падрыхтоўкі неабходнай праектнай дакументацыі, пачалася ў 2014 годзе, а ўжо 8 ліпеня, у знакавы для каталіцкай супольнасці дзень касцёл адчыніў свае дзверы.

У 2014 годзе адбылося асвячэнне храма. Раздзяліць добрую падзею з настаяцелем храма Добрага Пастара, ксяндзом Чэславам Ёйка, прыехалі яго суайчыннікі з Польшчы. Душэўныя песні, цёплыя словы, падарункі, сярод якіх асаблівай увагі варта рэліквія - кропля крыві папы рымскага Яна Паўла II, якая валодае цудадзейнай моцай. Нечаканым сюрпрызам для прыхаджан увянчалася царкоўная служба - поруч з галоўнай храмавай іконай Добрага Пастара размясцілася ікона Божай Маці з немаўлём, раскапаная ў свой час на тэрыторыі Гарадца і перададзеная добрымі людзьмі ў касцёл на вечную памяць.

**Храм пратэстанскі**. Дата будаўніцтва: пасля 1990 года.



# Свята вёскі - незабыўны і ўрачысты дзень




Свята вёскі – гэта свята ўсіх жыхароў, значная падзея, якая аб’ядноўвае мінулае, сучаснае і будучае роднага краю. Маштабна і з густам адзначаюцца Дні вёскі ў аграгарадку Гарадзец.















## *2019 год*

Праграма «Аграград» (*аўтар і вядучая Праскоўя Якіменка*) выходзіць у эфір на канале «Беларусь-4. Брэст» і знаёміць з рэгіёнамі вобласці і іх жыхарамі.

У 2019 годзе «Аграград» прысвяціў аграгарадку Гарадзец Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці дзве праграмы. Героямі іх сталі жыхары Гарадца - тыя, хто раскрыў для сябе жыццё ў вёсцы ва ўсёй яе прывабнасці і імкнецца паляпшаць яго якасць, тыя, хто сваёй шчырай працай прымнажаюць здабыткі былых пакаленняў.

Кароткія эпізоды з зусім непрыдуманых гісторый - гісторый, напоўненых жыццёвай сілай і пазітыўнай энергіяй. У кожнага чалавека - свой жыццёвы шлях. Іх яркія дыялогі, бачанне эканамічных і сацыяльных задач у аграпрамысловай сферы дазволілі ўявіць жыццё ў вёсцы найбольш поўна. Людзям ёсць дзе жыць, ёсць дзе працаваць, ёсць куды схадзіць... А галоўнае — яны адчуваюць, што іх чуюць, да іх праблем ставяцца неабыякава.

Відавочна, што тут жывуць працавітыя, таленавітыя людзі, якія любяць родны край, ведаюць свае карані, імкнуцца данесці да нашчадкаў прыгажосць свайго мястэчка, стараюцца захаваць, зберагчы тое, што засталося ім ад продкаў.

***Жыхары аграгарадка ўпэўнены, што будучае ў Гарадца ёсць,***
***і яны самі яго будуюць!***

# ВЯДОМЫЯ ЗЕМЛЯКІ

**У кожнага чалавека *на зямлі ёсць месца, дзе ён нарадзіўся, зрабіў першыя крокі, адкуль выйшаў у дарогу пад назвай – жыццё. Вёска Гарадзец па праве ганарыцца сваімі жыхарамі, у ліку якіх вучоныя, заслужаныя работнікі.***

***Вучоныя***

**СОЎПЕЛЬ Ігар Васільевіч** - беларускі вучоны, спецыяліст у вобласці тэхнічнай кібернетыкі і інфарматыкі. Доктар тэхнічных навук (1991), прафесар (1994).



Нарадзіўся 8 красавіка 1949 года ў вёсцы Гарадзец Кобрынскага раёна. Выпуснік 1966 года Гарадзецкай сярэдняй школы. Закончыў у 1971 годзе матэматычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Працаваў у Інстытуце матэматыкі АН БССР.

У 1976-1978 гадах - аспірант кафедры матэматычнага забеспячэння аўтаматычнай сістэмы кіравання (АСК) БДУ.

У 1980 годзе І. В. Соўпель абараніў кандыдацкую дысертацыю, з 1981 года ён дацэнт. У 1991 годзе навуковец абараніў доктарскую дысертацыю па тэме «Аўтаматызаваная перапрацоўка тэксту на аснове ўзнаўленчага мадэліравання лінгвістычных аб’ектаў і працэсаў». Навуковае званне прафесара прысвоена ў 1994 годзе.

З 1997 года Ігар Васільевіч - загадчык кафедры матэматычнага забеспячэння АСК факультэта прыкладной матэматыкі БДУ.

І. В. Соўпель з’яўляецца навуковым кіраўніком лабараторыі інтэлектуальных інфармацыйных сістэм. Ён сфармуляваў і развіў канцэпцыю новага навуковага напрамку ў галіне штучнага інтэлекту - узнаўленчага мадэліравання лінгвістычных аб’ектаў і працэсаў. Яго навуковыя і прыкладныя інтарэсы цесна звязаны з праектаваннем, разработкай і ўкараненнем сістэм аўтаматычнай апрацоўкі тэкстаў, уключаючы сістэмы лінгвістычных баз ведаў, семантычнага аналізу тэкстаў, аўтаматычнага рэферыравання, машыннага перакладу, інтэлектуальных інтэрфейсаў карыстальніка, інжынерыі ведаў, інтэлектуалізацыі інфармацыйных сістэм.

Навуковец з’яўляецца аўтарам шэрагу вынаходніцтваў у галіне штучнага інтэлекту, якія запатэнтаваны ў міжнародных патэнтных фондах. Пад яго кіраўніцтвам распрацаваны такія знакамітыя ў сучаснай інфарматыцы інтэлектуальныя інфармацыйныя сістэмы, як Cobrain, Knowledgist, Vedy, Goldfive Intelligence, а таксама шэраг сістэм у межах важнейшых рэспубліканскіх навукова-тэхнічных праграм, якія забяспечваюць і развіваюць камп’ютарную форму існавання беларускай мовы. Стварыў камп’ютарную сістэму беларуска-рускага і руска-беларускага машыннага перакладу тэкстаў.

Ігар Васільевіч з’яўляецца членам Навукова-метадычнага савета Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. У 1999 годзе ўзнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь».

**ІВАНЮК Уладзімір Рыгоравіч** (1941-2009) - вучоны ў галіне аховы раслін, член-карэспандэнт НАН Беларусі, член-карэспандэнт Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь. Доктар біялагічных навук, прафесар.



Нарадзіўся 23 ліпеня 1941 года ў вёсцы Мяфёдавічы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Дзяцінства прыйшлося на цяжкія, галодныя ваенныя і пасляваенныя гады. Выпаўшыя на яго долю выпрабаванні станоўча адлюстраваліся на любові да працы, жыццёвай сіле і трываласці будучага вучонага.

У 1959 годзе Уладзімір Іванюк закончыў Гарадзецкую сярэднюю школу. Паступіў на прырода-геаграфічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна, які з адзнакай закончыў у 1964 годзе.

Па рэкамендацыі вучонага савета Уладзімір Іванюк паступіў у аспірантуру Беларускага навукова-даследчага інстытута бульбаводства і агародніцтва, з 1966 года працаваў там малодшым навуковым супрацоўнікам. У 1969 годзе яму была прысуджана навуковая ступень кандыдата біялагічных навук. У1971–1986 гадах – старшы навуковы супрацоўнік; у 1986–1989 гадах – загадчык аддзела, у 1989–1999 гадах – галоўны навуковы супрацоўнік Беларускага навукова-даследчага інстытута абароны раслін.

У 1982 годзе Уладзімір Рыгоравіч стаў доктарам біялагічных навук, у 1992 годзе – прафесарам, членам-карэспандэнтам Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь. З 1999 года працаваў галоўным навуковым супрацоўнікам Беларускага НДІ бульбаводства (з 2006 года – Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па бульбаводству і плодаагародніцтву). Адначасова ў 1998–2005 гадах – прафесар кафедры Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта і кафедры БДСХА. У 2003 годзе - член-карэспандэнт НАН Беларусі.

У. Р. Іванюк – аўтар каля 500 навуковых прац, у тым ліку 13 манаграфій, 12 вынаходніцтваў. У вучонага шмат навуковых прац у вобласці імунітэту і абароны сельскагаспадарчых культур ад хвароб і шкоднікаў. Ён правёў вывучэнне біялогіі ўзбуджальнікаў хвароб бульбы, агароднінных культур, лубіну і інш. Усталяваў структуру папуляцый і яе дынаміку ў прасторы і часе. Выявіў эфектыўнасць шэрагу агратэхнічных прыёмаў, пестыцыдаў і біялагічных сродкаў абароны супраць комплексу грыбных і бактэрыяльных захворванняў. Распрацаваў матэматычныя мадэлі ўзаемаадносін у сістэме «расліна – патаген – навакольнае асяроддзе», якія дазваляюць прагназаваць характар праявы найболей шкоднасных захворванняў сельскагаспадарчых культур у Беларусі і планаваць аб’ёмы правядзення ахоўных мерапрыемстваў. Выявіў спосабы прыгнечання паразітычнай актыўнасці патагенаў і павышэнне хваробаўстойлівасці сельскагаспадарчых культур.

У. Р. Іванюк – суаўтар сорту бульбы Дабро, памідораў Ружа, Віліна, Калінка, Аранж. Уладзімір Рыгоравіч актыўна займаўся выкладчыцкай дзейнасцю. За 25 гадоў падрыхтаваў 19 кандадатаў навук. Заўсёды ў даступнай, зразумелай форме імкнуўся перадаць свае веды, свой жыццёвы вопыт маладому пакаленню даследчыкаў. Вучні запомнілі эрудзіраванага і мудрага выкладчыка, надзейнага сябра, зносіны з якім прыносілі інтэлектуальнае і духоўнае абагачэнне. Гэта быў сціплы і адкрыты чалавек.

Частку свайго часу У. Р. Іванюк аддаваў прапагандзе навуковых ведаў: выступаў з лекцыямі і дакладамі на навуковых з’ездах, канферэнцыях, вытворчых семінарах, курсах павышэння кваліфікацыі, даваў рэкамендацыі па абароне раслін ў СМІ.



Праца Уладзіміра Рыгоравіча неаднаразова адзначалася граматамі, у тым ліку Граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, медалямі ВДНГ.

Уладзімір Рыгоравіч Іванюк памёр 22 мая 2009 года.

Багатая навуковая спадчына, якую пакінуў беларускі навуковец, ставіць яго ў адзін шэраг з найбольш вядомымі айчыннымі і замежнымі вучонымі ў вобласці фітапаталогіі і фітаімуналогіі.

13–15 ліпеня 2011 года адбылася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная памяці У. Р. Іванюка.

**КАРПУК Андрэй Андрэевіч** (1944-2012) - беларускі матэматык, кандыдат фізіка-матэматычных навук (1974), прафесар (1993).



Нарадзіўся 24 верасня 1944 года ў вёсцы Акцябр Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Акцябрскую 7-гадовую школу, затым Гарадзецкую сярэднюю школу. Ён быў заўсёды душой калектыву, з дзяцінства любіў матэматыку і ахвотна дапамагаў таварышам выконваць хатнія заданні па матэматыцы.

У 1966 годзе Андрэй Карпук закончыў Брэсцкі педагагічны інстытут, фізіка-матэматычны факультэт. Нягледзячы на напружаную вучобу, знаходзіў час для заняткаў спортам (гуляў за зборную каманду ВНУ па футболе, гандболе, валейболе). Былі паездкі ў складзе студэнцкіх атрадаў на цалінныя будоўлі. Менавіта тады Андрэй Карпук быў узнагароджаны медалём «За асваенне цалінных земляў».

З 1967 года А. А. Карпук - выкладчык Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута, з 1972 года - выкладчык Беларускага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі.

Закончыў аспірантуру Інстытута матэматыкі АН БССР. У 1974 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю. У 1975 годзе становіцца дацэнтам кафедры вышэйшай матэматыкі, у 1993 годзе - прафесарам.

Напісаў шмат навуковых прац па матэматыцы і фізіцы. Аўтар падручнікаў і дапаможнікаў для ВНУ.

Андрэй Андрэевіч Карпук памёр у верасні 2012 года.

## *Заслужаныя работнікі*

**ЗАПАШНІК Яўгеній Казіміравіч** - заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь, урач-стаматолаг.

Нарадзіўся Яўгеній 28 чэрвеня 1948 года ў вёсцы Гарадзец Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці.

Закончыў у 1967 годзе Брэсцкае медыцынскае вучылішча. З 1967 па 1968 год працаваў памочнік санітарнага ўрача Кобрынскай цэнтральнай раённай бальніцы.

У 1973 годзе закончыў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут.

З 1973 года па 1981 год - урач-стаматолаг Брэсцкай абласной стаматалагічнай паліклінікі, з 1981 года па 1986 год - галоўны ўрач гарадской стаматалагічнай паліклінікі № 2 г. Брэста. З 1986 года працаваў галоўным урачом лячэбна-прафілактычнай установы «Брэсцкая абласная стаматалагічная паліклініка». Галоўны пазаштатны стаматолаг Брэсцкай вобласці.

Я. К. Запашнік, які шмат гадоў узначальваў абласную паліклініку, зрабіў немалы ўклад у развіццё стаматалогіі Брэстчыны. За гады яго працы быў створаны калектыў прафесіяналаў, сапраўдных майстроў сваёй справы. Вялікі практычны вопыт Яўгенія Казіміравіча, яго веды, майстэрства, метады работы запатрабаваны і сёння.

Узнагароджаны значком «Выдатнік аховы здароўя». Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 469 ад 27 верасня 2004 года Яўгенію Казіміравічу Запашніку прысвоена званне «Заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь».

**СТАШЭЎСКАЯ Ганна Антонаўна** - заслужаны настаўнік Беларускай ССР.



Нарадзілася ў 1928 годзе ў вёсцы Конань Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці.

Закончыла Рэчыцкае педагагічнае вучылішча.

Працавала выхавацелем Антопальскага дзіцячага дома, завучам Гарадзецкага дзіцячага дома.

… Выпускніцу Рэчыцкага педагагічнага вучылішча ў 1948 годзе ў дзіцячым доме, што размясціўся ў вёсцы Гарадзец, сустрэлі адразу 120 пар вачэй сірот. То былі дзеці, бацькі якіх загінулі ў час вайны, вязні канцэнтрацыйных лагераў з нумарамі на руках. Маладая выхавальніца Ганна Антонаўна разам з іншымі супрацоўнікамі дзіцячага дома не шкадавала ні сіл, ні часу, каб сагрэць дзяцей сваёй цеплынёй, увагай. Яна была побач у час падрыхтоўкі ўрокаў, хвіліны адпачынку і працы. Выдатна спраўлялася са сваімі абавязкамі, аб чым сведчыць павышэнне яе па рабоце: у 1950 годзе Ганна Антонаўна ўжо загадчык навучальнай часткі...

У той час у вобласці было 11 дзіцячых дамоў. Адзін з лепшых - Гарадзецкі. Кожны, хто наведваў яго, адзначаў атмасферу цеплыні і ўзаемаразумення паміж дарослымі і дзецьмі. Ганна Антоноўна памятала не толькі імёны выхаванцаў Гарадзецкага дзіцячага дома, але і ведала, дзе большасць з іх знаходзіцца, як склалася жыццё, дзе і як жывуць іх дзеці. У Гарадзец ішла вялікая колькасць пісьмаў калі па канкрэтнаму адрасу, а калі на прозвішча Маеўскай (дзявочае прозвішча) ці проста на сельсавет, з просьбай адшукаць

Ганну Антонаўну, якая ў цяжкія пасляваенныя гады аддавала асірацелым дзецям і час, і нервы, і фізічныя сілы, і што самае галоўнае, часцінку свайго сэрца, нерастрачанай пяшчоты. А колькі выхаванцаў Ганны Антонаўны пабывала ў Гарадцы, каб «зазірнуць у дзяцінства, цяжкае і шчаслівае», сустрэцца з тымі, хто дапамагаў ім у нялёгкі час!

Дзіцячы дом, школа-інтэрнат, сярэдняя школа, вялікая грамадская работа… Аб гэтых этапах яе жыцця і работы сведчаць не толькі запісы ў працоўнай кніжцы, але і ўзнагароды. Уклад Ганны Антонаўны Сташэўскай у выхаванне дзяцей быў высока ацэнены: у 25 гадоў яна атрымала значок «Выдатнік народнай адукацыі», потым, працуючы ўжо ў школе-інтэрнаце, стала «Заслужаным настаўнікам БССР». Званне было прысвоена 28 жніўня 1965 года. Але самае дарагое - памяць былых выхаванцаў. Лёс раскідаў іх па розных кутках вялікай дзяржавы, але дзе б яны ні былі, сваю выхавальніцу не забывалі.

**ШАЎЧУК Ганна Рыгораўна** - заслужаны работнік аховы здароўя Беларускай ССР.



Нарадзілася ў 1933 годзе ў вёсцы Нятрэба Кобрынскага павета (цяпер Нятрэба Кобрынскага раёна). Яе прафесіянальны шлях вырашыла цяжкая хвароба на фурункулёз, якую яна перанесла ў дзяцінстве.

Закончыла Брэсцкую фельчарска-акушэрскую школу.

Працавала фельчарам, выконваючым абавязкі галоўнага ўрача Дзмітравіцкай участковай бальніцы Камянецкага раёна; акушэркай, фельчарам, выконваючым абавязкі галоўнага ўрача Гарадзецкай урачэбнай амбулаторыі.

Хоць і пачынала Ганна Шаўчук самастойную працу ў Камянецкім раёне, куды яе накіравалі як маладога спецыяліста, але як чалавек і спецыяліст яна праявілася ў Кобрынскім, у в. Гарадзец. Тут прымяняла і ўдасканальвала веды, набытыя ў фельчарска-акушэрскай школе. Спачатку ў бальніцы на 15 ложкаў. А калі замест бальніцы ў Гарадцы стварылі ўрачэбны ўчастак, выконвала абавязкі галоўнага ўрача. Кіравала работай калектыву, калі ў вёсцы зноў адкрылі бальніцу, працавала фельчарам, а ў 1990 годзе перайшла на пункт «хуткай дапамогі». І ўсюды - наружаная праца. І не толькі днём: вясковага медработніка могуць падняць і ноччу. Ганна Рыгораўна ніколі не лічылася з часам, калі гаворка вялася пра здароўе людзей.

Яна дапамагала не толькі як спецыяліст. Ганна Шаўчук дзеля выратавання жыцця хворых людзей і кроў сваю аддавала - была донарам. А яшчэ выбіралася дэпутатам раённага і сельскага Савета дэпутатаў, узначальвала савет жанчын в. Гарадзец.

Медыцыне Ганна Рыгораўна прысвяціла 42 гады. У 1982 годзе ёй прысвоена званне «Заслужаны работнік аховы здароўя Беларускай ССР».

Не закончылася доктарства і па выхадзе жанчыны на пенсію. Аднавяскоўцы паранейшаму шукалі дапамогі ў свайго колішняга доктара, і Ганна Рыгораўна не адмаўляла. Хоць і хапае цяпер у Гарадцы медыцынскіх работнікаў, не-не ды і параіцца хтосьці з вяскоўцаў са старэйшай з іх.

Напэўна, прафесійны поспех Ганны Рыгораўны, які ўвасобіўся ў шматлікіх граматах раённага, абласнога, рэспубліканскага ўзроўняў і званні заслужанага работніка аховы здароўя, абумоўлены той чуласцю, з якой яна ставіцца да людзей.

**ЧЭРНІК Ігар Паўлавіч** - заслужаны работнік культуры Беларускай ССР, дырыжор, кампазітар, арганізатар і кіраўнік харавых калектываў.



Ігар Паўлавіч Чэрнік нарадзіўся 25 жніўня 1932 года ў вёсцы Гарадзец Кобрынскага павета (цяпер аграгарадок Гарадзец Кобрынскага раёна) у простай вясковай сям'і, дзе цанілася праца і музыка. Пазней у сваіх творах самабытны паэт і музыка часта будзе згадваць бацькоўскі дом, сваю вёсачку, дзе нарадзіўся і рос, дзе прайшлі незабыўныя гады апаленага вайной дзяцінства і пасляваеннай суровай юнацкасці.

Бацькі – сельскі фельчар Павел Фёдаравіч і настаўніца Ніна Макараўна – з дзіцячых гадоў прывілі хлопчыку любоў да музыкі. Сям’я Чэрнікаў лічылася самай музычнай у вёсцы. Маці добра іграла на мандаліне, бацька – на гітары, а сын – на акардэоне, і па вечарах у доме часта гучала музыка. Схільнасць да розных відаў мастацтва ў душу маленькага Ігара заклала яго маці – веруючы чалавек, якая пры Савецкай уладзе ўжо не працавала, а зберагала дом, выхоўвала дзяцей, спявала ў царкоўным хоры. У хаце, дзе былі гітара, мандаліна, фартэпіяна, цяжка было не асвоіць першыя навыкі музычнай адукацыі. Потым Ігар Чэрнік яе пашырыў, удасканаліў, а з часам і сам пачаў выкладаць.

У 1968 годзе Ігар Чэрнік закончыў Гродзенскае педагагічнае вучылішча, у 1983 годзе – Мінскі інстытут культуры. Працаваў мастацкім кіраўніком Антапальскага дзіцячага дома, кіраўніком фотагуртка і вакальнай групы Кобрынскага Дома піянераў, настаўнікам музыкі і спеваў СШ № 1 г. Кобрына, дырэктарам Кобрынскага раённага Дома культуры, дырэктарам Брэсцкага абласнога Дома народнай творчасці, мастацкім кіраўніком народнага хору настаўнікаў Камянецкага РДК, дырэктарам Чарнянскай дзіцячай музычнай школы, мастацкім кіраўніком народнага ансамбля народнай песні «Галасы Палесся» (Брэст), хормайстарам народнага хору «Колас» Гарадзецкага сельскага клуба.

За сваё жыццё І. П. Чэрнік стварыў пяць самастойных народных хораў: хор Кобрынскага РДК, народны хор настаўнікаў Камянецкага РДК, народны хор «Чарнічанка» саўгаса «Маладая гвардыя» Брэсцкага раёна, народны хор «Колас» Гарадзецкага калгаса-камбіната імя Дзяржынскага Кобрынскага раёна, народны ансамбль песні «Галасы Палесся» ў г. Брэсце. Усе без выключэння хоры, створаныя Ігарам Паўлавічам за час яго шматгадовай творчай дзейнасці, дабіваліся выдатных мастацкіх вынікаў, высокага вакальна-тэхнічнага майстэрства, яркай выразнасці, і ўсе яны атрымлівалі званне народнага калектыву.




Ігар Паўлавіч – аўтар шматлікіх твораў, напісаных для хору. Многім вядомыя «Песня аб Кобрыне», напісаная на словы і музыку Ігара Чэрніка, такія яго песні, як «Каханай жанчыне», «Крынічанка», «Край беларускі», «Развітальная», «Песня аб маме» і шмат іншых. У 2008 годзе выйшаў зборнік яго песень пад красамоўнай назвай «Песні сэрца». Паэтычнаму стылю Ігара Чэрніка ўласціва глыбокая шчырасць, павага да роднага краю, пашана да чалавека беларускай зямлі.

І. П. Чэрнік неаднаразовы пераможца шматлікіх конкурсаў, дыпламант розных фестываляў і удзельнік дзяржаўных канцэртаў. Па ўласнай ініцыятыве на грамадскіх пачатках ён вёў школу вакальна-харавога мастацтва Кобрынскага раёна, быў рэжысёрам-пастаноўшчыкам абласных і раённых святаў, аказваў метадычную дапамогу шматлікім народным хорам Кобрынскага раёна, з'яўляўся кіраўніком на грамадскіх пачатках ансамбля «Гарадчанка» ААТ «Гарадзец-Агра», створаным ім па асабістай ініцыятыве ўжо пасля выхаду на пенсію.



Нашага таленавітага земляка ведалі як у рэспубліцы, так і на прасторах былога СССР, і ганаровыя ўзнагароды - таму пацвярджэнне. Дзяржава, грамадскасць высока ацанілі талент і заслугі Ігара Паўлавіча. У снежні 1966 года ён быў узнагароджаны медалём «За трудовое отличие», у 1973-м - знакам Міністэрства культуры СССР «Отличник культурного шефства над селом». Высокае званне «Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР» (1975) Ігару Чэрніку прысвоена за ўзорную працу ў Кобрынскім Доме культуры, які пры яго дырэктарстве ў 1970-я гады быў прызнаны лепшым у рэспубліцы. Узнагароджаны шматлікімі дыпломамі і граматамі. Лаўрэат трох Усесаюзных фестываляў народнай творчасці.

У 1971 годзе - дэлегат з'езда дырэктараў Дамоў культуры СССР, на якім Беларусь прадстаўлялі толькі пяць чалавек. Радкі яго біяграфіі і асноўныя вехі творчасці адлюстраваны ў вядомым на абшарах СНД энцыклапедычным выданні «Кто есть кто в Республике Беларусь» (2005).

Больш за 60 гадоў Ігар Паўлавіч і яго верная спадарожніца жыцця, яго муза, жонка Валянціна Дзмітрыеўна пражываюць у шлюбе, які можна назваць узорным, бо іх сумеснае жыццё напоўнена каханнем і гармоніяй, узаемаразуменнем і падтрымкай.

Ігар Паўлавіч Чэрнік - унікальны чалавек, шматгранная і творчая асоба, дырыжор, кампазітар, былы кіраўнік народных хораў, таленавіты паэт. І хоць ён даўно ўжо на пенсіі, але працягвае займацца любімай справай. Усё свядомае жыццё гэтага выдатнага чалавека - гэта беззапаветнае служэнне людзям з дапамогай музыкі і песні.

**ПАРФЯНЮК Мікалай Яўгеньевіч** - заслужаны артыст Расійскай Федэрацыі, савецкі і расійскі музыкант, кампазітар, аранжыроўшчык, вакаліст.



Нарадзіўся 11 сакавіка 1957 года ў вёсцы Гарадзец Кобрынскага раёна. Вучыўся ў СШ № 5 горада Кобрына і адначасова ў музычнай школе.

У 1979 годзе закончыў Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут.

З 1974 года працаваў з групай «Золотая середина» (г. Брэст).

У 1981 годзе - артыст Разанскай абласной філармоніі, саліст і музыкант ВІА «Сверстники». У 1983 годзе пачаў працаваць у складзе групы «Фенікс», потым у «Синей птице», а пазней

перайшоў у групу «Транс», створаную музыкантамі расфармаванага «Аракса».

З 1987 года ў складзе групы «Транс» прыйшоў працаваць у «Ленком». Песні Мікалая Парфенюка выконвалі акцёры Мікалай Карачанцаў, Зміцер Спевакоў, Віктар Ракаў, Сяргей Сцяпанчанка. Напісаў музыку да кінастужак «Маленький принц», «Всадники ветра», «Львиная доля», да тэлестужак «Удар лотоса», «Замковый камень», «А. П.», «Шатун», да серыяла «Досье детектива Дубровского», да дакументальнага фільма «Враги народа» (BBC), тэлепраграмы ОРТ «Собрание заблуждений». З'яўляецца аўтарам музыкі да спектакляў «Ящерица» (тэатр «Колесо», г. Тальяці), «Юлий Цезарь» (тэатр імя Горкага, г. Уладзівасток), «Свои люди» (Дзяржаўны акадэмічны Малы тэатр, г. Масква), «Арена» (Маскоўскі Мастацкі Акадэмічны тэатр). Нароўні з музычнай дзейнасцю ў тэатры і кіно паспрабаваў сябе ў фільмах «Неотложка-2» і «Карьера Артуро Уи».

Указам Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі № 1071 ад 15 верасня 2003 года Мікалаю Яўгеньевічу Парфенюку прысвоена званне «Заслужаны артыст Расійскай Федэрацыі».

**ДЗЕМІДОВІЧ Мікалай Мікалаевіч**.



Нарадзіўся 17 снежня 1964 года ў вёсцы Гарадзец Кобрынскага раёна. У 1982 годзе закончыў Гарадзецкую сярэднюю школу.

Дапрызыўную падрыхтоўку прайшоў у Брэсцкай аўташколе ДТСААФ.

У сакавіку 1983 года прызваны ў Савецкую армію. Служыў у Туркестанскай ваеннай акрузе.

У кастрычніку 1983 года быў накіраваны ў Афганістан.

25 снежня 1984 года Мікалай разам з баявымі сябрамі суправаджаў транспартную калону. Пачаўся абстрэл. Снарад трапіў у бронетранспарцёр, і вадзіцель Мікалай Дземідовіч загінуў.

Узнагароджаны медалём. Пахаваны на могілках в. Гарадзец.

**ЧАРЧУК Васілій Міхайлавіч**



Дзяцінства і юнацтва хлопца з в. Мяфёдавічы супалі з living рознымі гістарычнымі падзеямі ў нашым краі. Вучобу ён пачынаў у польскай школе, заканчваў у савецкай, з-за вайны – пераросткам. Але, нягледзячы на гэта, веды меў трывалыя і вельмі хацеў ведаць яшчэ больш. І мару стаць настаўнікам ажыццявіў з першай спробы.

Пасля заканчэння Брэсцкага педагагічнага інстытута таленавітаму выпускніку прапанавалі прадоўжыць вучобу ў аспірантуры, але ён паехаў у в. Гарадзец, у школу, якую закончыў сам і дзе працавала жонка – настаўніца гісторыі.

Усё сваё жыццё Васілій Чарчук працаваў педагогам у Гарадзецкай сярэдняй школе. Выкладаў дзецям рускую мову і літаратуру. Мяркуючы па выказваннях яго былых вучняў, Васілій Міхайлавіч быў настаўнікам у поўным сэнсе гэтага слова. Яго ўрокі неслі вучням не толькі веды па рускай літаратуры і мове. Чалавек разнастайных інтарэсаў, ён пакараў

іх веданнем гісторыі роднага краю, літаратуры і культуры іншых народаў, уменнем маляваць, сваёй унутранай культурай. Нават калі Васілій Міхайлавіч выйшаў на пенсію, ён не згубіў сувязі са школай, вучнямі: падменьваў сваіх калег на час хваробы, вымушаных водпускаў; быў у курсе школьных спраў.

Разам з жонкай Верай Данілаўнай, настаўніцай гісторыі, у свой час захапіўся краязнаўствам. На аснове 8-га класа, дзе вучылася старэйшая дачка Галіна, яны арганізавалі краязнаўчы гурток. Працу пачыналі з мясцовага помніка ахвярам вайны. Васілій Міхайлавіч рабіў шматлікія запыты ў ваенныя архівы, у Гарадзец прыязджалі сваякі загінуўшых з Луганска, Раменскага. Даследаванне тэмы Вялікай Айчыннай вайны вялося шырока. Былі складзены спісы загінуўшых па ўсёй тэрыторыі Гарадзецкага сельсавета, сабрана шмат інфармацыі аб баявых дзеяннях. Васілій Міхайлавіч ахапіў вайну і як літаратар, сабраўшы нямала вершаў паэтаў-партызан, і тым самым унёс сваю лепту ў летапіс народнага подзвігу.

Удзячныя жыхары вёскі краязнаўцу і за ўстанаўленне даты заснавання вёскі, цікавыя старонкі з жыцця польскай пісьменніцы Марыі Радзевіч, сядзіба якой размяшчалася ў суседняй вёсцы Грушава. Васілій Міхайлавіч Чарчук – чалавек, які ведаў паданні і легенды аб усіх навакольных курганах, урочышчах.

У працэсе краязнаўчай работы было сабрана шмат цікавых экспанатаў. Значная частка з іх знаходзіцца ў школе. Найбольш дарагія – дома, дзе ў добрым суседстве размясціліся і кубак, з якога пілі яшчэ ў часы Пятра I, і сякач пачатку XX стагоддзя, і малітваслоў з драўлянай вокладкай. Вялікая колькасць тут і грашовых экспанатаў. Ёсць манеты XVII, XVIII стагоддзяў. Краязнаўчы фонд Васіля Міхайлавіча складае каля 100 выданняў.

У 1956 годзе Васілій Міхайлавіч пачаў збіраць кнігі, перыёдыку, якія з цягам часу перараслі ў хатнюю бібліятэку, дзе налічваецца пяць тысяч экземпляраў выданняў, у якіх прысутнічае не толькі літаратура сучасных аўтараў ці класікаў, але і захоўваюцца архіўныя матэрыялы XVIII, XIX і XX стагоддзяў, рэдкія кнігі.

В. М. Чарчук валодаў цудоўнай калекцыяй цікавых старажытных прылад з крэмня і камня, аб якой ведаюць у Беларускай і Расійскай Акадэміях навук, сведкамі чаму з'яўляюцца лісты супрацоўнікаў Акадэмій да Васілія Міхайлавіча, а таксама падараваная яму кніга.

З радасцю Васілій Міхайлавіч дзяліўся сваімі гістарычнымі набыткамі са школьнікамі, студэнтамі; вельмі любіў, калі яго запрашалі на розныя мерапрыемствы, дзе ён з задавальненнем знаёміў са сваімі знаходкамі, паказваў свае мастацкія палотны. Яго талент як мастака праявіўся з 1953 года, яшчэ ў час вучобы ў Брэсцкім інстытуце. І хоць спецыяльнай адукацыі па выяўленчай дзейнасці ён не меў, карціны ствараў не горш за кваліфікаванага мастака. Яго вырабы разышліся за межы ўласнага жылля. Напрыклад, адна з работ аздабляе адміністрацыйны будынак мясцовай улады. І ў гэтай дзейнасці Васілій Міхайлавіч застаўся верным роднаму Гарадцу: на большасці карцін - вясковыя краявіды.

Пералік захапленняў гэтага цікавага чалавека нельга не папоўніць яго любоўю да расліннага свету. Ён займаўся развядзеннем кветак, кустарнікаў, новых сартоў садавіны і агародніны. В. М. Чарчук лічыў, што, ведаючы гісторыю, ландшафт і каштоўнасць сваёй маленькай радзімы, мы зможам спазнаць больш поўна, хто мы такія.

У скарбонцы дасягненняў Васілія Чарчука — медаль «За працоўную доблесць» і вялікая колькасць грамат.

# СПІС КРЫНІЦ

***Артыкулы з кніг***


**Гарадзец** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1971. – Т. 3. – С. 346.

**Гарадзец** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1997. – Т. 5. – С. 39.

**Гарадзец** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. Т. 4. Брэсцкая вобласць. - Мінск, 2007. – Кн. 2. - С. 133-135.

**Гарадзец** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2012. – Т. 2. – С. 507.

**Городец** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. – С. 287.

**Парэцкі, Р. Я**. Гарадзец / Р. Я. Парэцкі // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 35-36.

**Якімовіч, Ю. А.** Гарадзецкі «Каралеўскі двор» / Ю. А. Якімовіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 36.

**Гарадзец** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 572-574. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Агрогородок** «Городецкий» // Агрогородки Брестчины. – Брест, 2010. – С. 158 : фот.

**В. Гарадзец**, цэнтр сельсавета. Брацкая магіла савецкіх воінаў; Вазнясенская царква; Помнік Дзяржынскаму // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць. - Мінск, 1984. - С. 230-231.

**Д. Городец,** центр сельсовета. Братская могила советских воинов; Вознесенская церковь; Памятнік Дзяржынскаму // Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область. – Минск, 1990. - С. 254-255.

**Вёска** Гарадзец, цэнтр сельсавета. Вазнясенская царква; Брацкая магіла савецкіх воінаў // Гісторыка-культурная спадчына Кобрыншчыны. – Баранавічы, 2001. - С. 11,19.

**Габрусь, Т. В.** Драўлянае хрысціянскае храмабудаўніцтва Беларусі / Т. В. Габрусь. – Мінск : Беларуская навука, 2020. – 318 с. : іл.

Гл. на с. 146 - Вазнясенская царква, в. Гарадзец.

**Гарадзец** // Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Мінск, 2004. – Т. 3. – С. 125.

**Гарадзецкая** царква Ушэсця // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 36 : фат.

**Гарадзецкі** народны хор «Колас» // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2012. – Т. 2. – С. 509.

**Жучкевич, В. А**. Дороги и водные пути Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Минск, 1978. – 144 с.

См. с. 46 Судостроение в середине XIX века в местечке Городец Кобринского уезда.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Сташэўская Ганна Антонаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 430. – (Вызначыліся працай).

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. **Чэрнік Ігар Паўлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 429. – (Вызначыліся працай).

**Кулагін, А. М**. В. Гарадзец, Кобрынскі раён Брэсцкай вобласці. Царква ў гонар Узнясення Гасподняга / А. М. Кулагін // Праваслаўныя храмы Беларусі : энцыклапедычны даведнік / А. М. Кулагін. – Мінск, 2007. – С. 113 : фат.

**Кулагін, А. М.** В. Гарадзец, Кобрынскі раён Брэсцкай вобласці. Касцёл Звеставання Найсвяцейшай Дзеве Марыі / А. М. Кулагін // Каталіцкія храмы Беларусі / А. М. Кулагін. – Мінск, 2008. – С. 407.

**Мароз, В. В**. XV стагоддзе. Гарадзец / В. В. Мароз // Драўляныя сакральныя помнікі Берасцейшчыны : нарысы гісторыі, археалогіі і культуры / В. В. Мароз. – Мінск, 2018. – С. 44, 54-55.

**Музей** «Гісторыя вёскі Гарадзец» ДУА «Гарадзецкі дзіцячы сад – сярэдняя школа» // Народныя музеі ўстаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь. - Мінск, 2019. - С. 18-19.

**Несцярчук, Л. М.** Гарадзец. Horodec. Городец / Л. М. Несцярчук // Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X-XX ст. (гісторыя, стан, перспектывы) / Л. М. Несцярчук. – Мінск, 2002. – С. 190-191.

Палацава-паркавы ансамбль у Гарадцы належыць да ліку страчанай гістарычнай спадчыны.

**Русак, Н.** Ёсць на што падзівіцца дый чаму здзівіцца... Гарадзец. Культурніцкі досвед у асобна ўзятым сельсавеце / Наталля Русак // Найноўшая спадчына Новай зямлі: Беларусь культурная : камандзіроўка ў 1000 дзён : зборнік артыкулаў. – Мінск, 2009. – С. 28-30.

**Соўпель Ігар Васільевіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2002. – Т. 15. – С. 91.

**Совпель Игорь Васильевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 2. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 279.

**Совпель Игорь Васильевич** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2008. – Т. 7. - С. 16–17.

**Совпель Игорь Васильевич** // Прафесары і дактары навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, 1921-2001 : 80 год. - Мінск, 2001. - С. 260.

**Соўпель Ігар Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 442.

**Федорук А. Т.** Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т. Федорук. - Мінск, 2004.- 574 с.

См. на с. 92,143,182,332,359.

**Цітоў, А**. Гарадская геральдыка Беларусі / Анатоль Цітоў. – Мінск : Полымя, 1989. – 207 с.

Гл. в. Гарадзец – С. 36,121-123.

**Черник Игорь Павлович** // Кто есть Кто в Республике Беларусь. 2005 : к 60-летию Победы в Великой Отечественной войне : [в 2 т.]. – Минск, 2005. – Т. 2. – С. 367.

## *Артыкулы з перыядычных выданняў*

**Шляжко, Н.** Окутаны любовью к песне / Наталья Шляжко // Брестский вестник. – 2022. – 31 марта (№ 13). – С. 20 : фот.

Народный ансамбль песни «Черничанка» получил свое название от имени первого руководителя И. Черника.

**Бакун, Е.** Многие лета творческих поисков / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2021. — 8 верасня (№ 71). — С. 5 : фот.

О дирижере, композиторе, талантливом поэте — единственном в Кобринском районе заслуженном работнике культуры Белорусской ССР Игоре챠рнике из Городца.

**Белов, Д**. Первый в области перевез 2 тысячи тонн зерна / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2021. — 4 жніўня (№ 61). — С. 1, 3 : фот.

Водитель ОАО «Городец-Агро» Кобринского района Станислав Лакишик первым в области перевез две тысячи тонн зерна.

**День** открытых дверей — для будущих водителей / по информации Кобринско-Малоритской МРОС ДОСААФ // Кобрынскі веснік. - 2021. — 2 студзеня (№ 1). — С. 10.

В ГУО «Городецкий детский сад-средняя школа» организовано обучение учащихся по программе подготовки водителей колесных тракторов категории А.

**Ефтифеева, Н. П.** Эстафета добра / Наталья Ефтифеева // Кобрин-информ. - 2021. — 28 января (№ 4). — С. 13 : фот.

Городецкая публичная библиотека совместно с приходом храма Вознесения Господня аг. Городец Кобринского района провела эстафету добра «Рождества волшебные мгновения».

**Ефціфеева, Н. П**. Эстафета дабрыні / Наталля Ефціфеева ; фота аўтара // Літаратура і мастацтва. - 2021. — 29 студзеня (№ 4). — С. 16 : фат.

Гарадзецкая публічная бібліятэка сумесна з прыходам храма Ушэсця Гасподняга аграгарадка Гарадзец Кобрынскага раёна правяла эстафету дабрыні «Раства чароўныя імгненні».

**Курец, А. Н.** Вперед, к Выгоде! / Александр Курец ; фото Павла Богуша // Сельская газета. - 2021. — 17 июня (№ 69). — С. 5 : фот.

О пароме на Днепровско-Бугском канале возле д. Выгода Кобринского района, который соединяет земли ОАО «Городец-агро».

**Курец, А. Н.** Гонка за лидерами / Александр Курец ; фото Дмитрия Белова // Сельская газета. - 2021. — 5 августа (№ 90). — С. 6 : фот.

О передовых комбайнерах на жатве в ОАО «Городец-агро» Кобринского района и других хозяйствах Брестской области.

**Курец, А. Н.** Молочный рост на первый укос / Александр Курец ; фото Павла Богуша // Сельская газета. - 2021. — 15 июня (№ 68). — С. 1, 7 : фот.

О заготовке зеленых кормов в ОАО «Городец-агро» Кобринского района и других хозяйствах Брестской области.

**Курец, А.** Великий почин / Александр Курец ; фото Дмитрия Белова // Сельская газета. - 2021. — 16 марта (№ 30). — С. 1, 8 : фот.

О начале сева овса и многолетних трав в ОАО «Городец-агро» Кобринского района.

**Курец, А. Н.** По пятьсот который год / Александр Курец ; фото Павла Богуша // Сельская газета. - 2021. — 15 января (№ 5). — С. 11 : фот.

О популярности чтения «Сельской газеты» в ОАО «Городец-Агро» Кобринского района.

**Курец, А. Н.** Работ восемь, самое время наверстать / Александр Курец ; фото Павла Богуша // Сельская газета. - 2021. — 2 октября (№ 115). — С. 15 : фот.

Аграрии ОАО «Городец-агро» Кобринского района вышли на финишную прямую сева озимых и ускорили уборку урожая.

**Пашковіч, Л.** Праца на славу / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2021. — 28 ліпеня (№ 59). — С. 1 : фат.

Вадзіцель з ААТ «Гарадзец-агра» Кобрынскага раёна Станіслаў Лакішык першым у районе перавёз першую тысячу тон збожжа.

**Рагін, Я.** Цнота з гарэзіяй / Яўген Рагін // Культура. - 2021. — 30 студзеня (№ 5). — С. 10.

Гарадзецкая публічная бібліятэка сумесна з прыходам храма Ушэсця Гасподняга аграгарадка Гарадзец Кобрынскага раёна правяла эстафету дабрыні.

**Роніна, Д.** Малочныя рэкі / Дзіяна Роніна ; фота Алены Даўжанок // Звязда. - 2021. — 14 жніўня (№ 155). — С. 8 : фат.

Пра дзейнасць ААТ «Гарадзец-агра» Кобрынскага раёна.

**Бакун, А.** Годныя дзеці сваіх бацькоў / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2020. — 27 чэрвеня (№ 49). — С. 1-2 : фат.

ААТ «Гарадзец-агра» - лідар па маладых кадрах у Кобрынскім раёне.

**Бакун, А.** На перадавой — моладзь / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2020. — 14 лістапада (№ 88). - С. 9 : фат.

У ААТ «Гарадзец-агра» ствараюць добрыя ўмовы для жыцця и камфорту маладых спецыялістаў.

**Бялоў, Д.** Галоўнае багацце — людзі і зямля / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2020. — 15 студзеня (№ 3). — С. 4 : фот.

ААТ «Гарадзец-агра» — буйнейшая гаспадарка Кобрыншчыны.

**Елизарова, Ж**. Летописец городецкого края / Жанна Елизарова ; фото из архива Натальи Чижевской // Кобрынскі веснік. - 2020. — 12 жніўня (№ 62). — С. 6 : фот.

О ветеране педагогического труда ГУО «Городецкий детский сад-средняя школа» Г. П. Чижевской.

**Козлович, В.** На финише скорость не сбавляют / Валентина Козлович // Кобрынскі веснік. - 2020. — 14 августа (№ 157). — С. 8 : фот.

В ОАО Г«ородец-агро» заканчивают уборку зерновых.

**Курец, А. Н**. Сотня в день на точечном высеве / Александр Курец ; фото автора // Сельская газета. - 2020. — 19 марта (№ 32). — С. 1, 6 : фот.

В кобринском ОАО «Городец-агро» активизировались полевые работы.

**Пашкович, Л. В.** Для городецких ребят / Людмила Пашкович // Заря. - 2020. — 19 декабря (№ 102). — С. 7.

В аг. Городец Кобринского района установлена новая детская площадка.

**Пашкович, Л. В.** Детская площадка для городецких малышей / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2020. — 19 снежня (№ 98). — С. 3 : фот. .

В аг. Городец Кобринского района появилась современная детская площадка.

**Праздник** православной книги в приходе храма Вознесения Господня аг. Городец / Пресс-служба Брестской епархии // Кобрин-информ. - 2020. — 2 апреля (№ 14). — С. 11 : фот.

Праздник православной книги провели сотрудники Городецкой сельской библиотеки совместно с преподавателями и учащимися приходской воскресной школы

**Ализар, К**. Городецкая библиотека лучшая в области / Ксения Ализар // Кобрынскі веснік. - 2019. — 6 ліпеня. — С. 4.

По итогам областного тура V Республиканского конкурса «Библиотека - центр духовно-нравственного просвещения и воспитания» филиал «Городецкая публичная библиотека» занял I место среди сельских библиотек за реализацию социокультурного проекта «Все вместе: семья, церковь, библиотека».

**Ализар, К**. Судьба подарила детей / Ксения Ализар // Кобрынскі веснік. - 2019. — 7 сакавіка. — С. 5.

За рождение и воспитание пятерых детей И. Ничик из аг. Городец награждена орденом Матери.

**Елизарова, Ж**. З клопатам пра малую радзіму / Жанна Елізарава // Кобрынскі веснік. - 2019. — 26 кастрычніка. — С. 4 : фот.

Гарадзецкі сельсавет — другая па велічыні адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка Кобрынскага раёна.

**Ефтифеева, Н**. Библиотека — центр духовности / Наталья Ефтифеева // Кобрин-информ. - 2019. — 19 декабря (№ 51). — С. 4 : фот.

Городецкий филиал Кобринской районной централизованной библиотечной системы занял первое место в республиканском конкурсе «Библиотека — центр духовного просвещения и воспитания».

**Ефтифеева, Н.** Семья, церковь, библиотека / Наталья Ефтифеева // Кобрин-информ. - 2019. — 11 июля (№ 28). — С. 4.

По итогам областного тура V Республиканского конкурса «Библиотека - центр духовно-нравственного просвещения и воспитания» Городецкий филиал Кобринской районной централизованной библиотечной системы занял I место среди сельских библиотек.

**Курец, А**. Время — деньги / Александр Курец // Сельская газета. - 2019. — 12 сентября. — С. 5 : фот.

В ОАО «Городец-агро» строго выдерживают график сева озимых.

**Курец, А.** Балансируя на кормовых весах / Александр Курец // Сельская газета. - 2019. — 24 августа. — С. 1, 6.

Специалисты ОАО «Городец-Агро» Кобринского района уверены — хозяйство заготовит полуторагодичный запас кормов.

**Курец, А.** Лучший Городец земли / Александр Курец // Сельская газета. - 2019. — 14 мая. — С. 1, 8-9.

Люди и сегодняшний день аг. Городец Кобринского района.

**Курец, А.** Санаторная путевка — отличный бонус / Александр Курец // Сельская газета. - 2019. — 9 апреля. — С. 8.

Оператор по откорму крупного рогатого скота В. Брашко из ОАО «Городец-агро» — среди передовиков аграрной отрасли области.

**Лавринович, В.** Встреча через полвека / Василий Лавринович // Кобрынскі веснік. - 2019. — 18 снежня (№ 98). — С. 8 : фот.

Состоялась встреча выпускников 1969 года Городецкой школы-интерната.

**Лазоўская, Т.** Умець зарабляць грошы, а не толькі траціць / Таццяна Лазоўская, Алена Даўжанок // Звязда. - 2019. — 7 верасня (№ 170). — С. 9 : фот.

ААТ «Гарадзец-агра».

**Лауреат** из Городца // Заря. - 2019. — 11 декабря (№ 98). — С. 19 : фот.

За первое место в республиканском конкурсе «Библиотека — центр духовного просвещения и воспитания» в номинации «Семья — наследница нравственных и духовных ценностей» Городецкая сельская библиотека награждена грамотой Белорусского Экзархата.

**Мельнік, Р**. На абмеркаванні — пытанні першай неабходнасці / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2019. — 9 кастрычніка. — С. 2.

Сумеснае пасяджэнне раённага выканаўчага камітэта і прэзідыума раённага Савета дэпутатаў тычылася работы Гарадзецкага сельвыканкама па вырашэнні задач жыццезабеспячэння насельніцтва.

**Михович, С.** В чем сила? В единстве / Сергей Михович // Сельская газета. - 2019. — 9 июля. — С. 8.

Руководитель ОАО «Городец-агро» принимал участие в работе съезда Республиканского агропромышленного союза (БелАПС).

**Муха, Ф.** Кому повезло с Фоминичной / Федор Муха // Заря. - 2019. — 12 июня. — С. 18.

В кафе «Уют» Кобринского райпо агрогородка Городец работают замечательные повара, всегда кипит напряженная производственная жизнь.

**Папко, Ю.** Ад коркі да коркі / Юлія Папко // Рэспубліка. - 2019. — 26 ліпеня. — С. 4, 5 : фот.

Фермер з аг. Гарадзец М. Віктаровіч вырошчвае салодкія і смачныя кавуны.

**Сотрудничество** храма и библиотеки // Кобрин-информ. - 2019. — 29 августа (№ 35). — С. 12 : фот.

Сотрудничество Городецкой публичной библиотеки с Православной церковью Вознесения Господня продолжается не один год.

**Трехдневный** поход по родным местам // Кобрин-информ. - 2019. — 11 июля (№ 28). — С. 11 : фот.

Учащиеся Воскресной школы прихода храма Вознесения Господня аг. Городец совершили трехдневный поход по родным местам.

**Урок** живописи // Кобрин-информ. - 2019. — 6 ноября (№ 45). — С. 11.

Воспитанники Воскресной школы храма Вознесения Господня и учащиеся ГУО «Городецкий детский сад-средняя школа» принимали участие в проведении урока живописи.

**4 чэрвеня** 1785 года // Звязда. - 2019. — 4 чэрвеня. — С. 16.

У г. Гарадзец Кобрынскай эканоміі адбылося адкрыцце Каралеўскага (Дняпроўска-Бугскага) канала.

**Аб узнагароджанні** : Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь // Сельская газета. - 2018. — 10 февраля. — С. 3.

Медалем «За працоўныя заслугі» узнагароджаны трактарыст-машыніст ААТ «Гарадзец-агра» А. А. Заноўскі.

**Борисевич, Т**. «Масленица» в библиотеке / Тамара Борисевич // Кобрынскі веснік. - 2018. — 21 лютага. — С. 8.

Проводы зимы и встречу Масленицы с частушками и играми в преддверии масленичной недели устроили работники Городецкой публичной библиотеки.

**Бялоў, Д**. Вадзім Грамічук: «Не шукайце лёгкага хлеба!» / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2018. — 18 жніўня. — С. 2.

У ААТ «Гарадзец-агра» адзначаецца рост усіх паказчыкаў у жывёлагадоўлі.

**Гарадзецкі гасцінец** : тэматычная старонка // Кобрынскі веснік. - 2018. — 15 жніўня. — С. 4.

**Дубіна, Л**. Пытанні розныя — падыход аднолькавы / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2018. — 15 жніўня. — С. 4.

Уважліва адносіцца да зваротаў грамадзян старшыня Гарадзецкага сельвыканкама Д. Міроненка.

**Дубіна, Л.** Работа кіпіць / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2018. — 17 лістапада. — С. 10.

ААТ «Гарадзец-агра» — буйнейшая гаспадарка ў Кобрынскім раёне.

**Дубіна, Л.** Шчасце жыць разам / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2018. — 18 жніўня. — С. 10.

Сямейная пара Любові і Васіля Ячнікаў з Гарадца адзначыла 55 гадоў шлюбу.

**Елізарава, Ж.** Ушанаваныя ордэнам Маці / Жанна Елізарава // Кобрынскі веснік. - 2018. — 17 сакавіка. — С. 3.

Высокі знак мацярынскай доблесці атрымалі І. Вайтовіч з аг. Гарадзец і А. Жолах з в. Быстрыца.

**Зановский** в круге забот // Сельская газета. - 2018. -15 февраля. - С. 8.

Указом Президента от 05.02.2018 тракторист-машинист ОАО «Городец-агро» А. А. Зановский награжден медалью «За трудовые заслуги».

**Курец, А.** Без мотивации такой рывок невозможен / Александр Курец // Сельская газета. - 2018. — 24 ноября. — С. 8.

В ОАО «Городец-Агро» растет производство и реализация молока.

**Курец, А.** В доме все должно быть свое / Александр Курец // Сельская газета. - 2018. — 20 января. — С. 7.

ОАО «Городец-Агро» — это своеобразный холдинг, созданный из шести хозяйств.

